*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

21 ЛІСТАПАДА 2008 г. ПЯТНІЦА
№ 220 (26333)
Кошт 500 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Жыллё маё

## Маючыя патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў змогуць атрымаць зямельныя ўчасткі без аўкцыёнаў

**Аб механізмах стымулявання развіцця індывідуальнага будаўніцтва жылля вялася гаворка на пасяджэнні «круглага стала» ў грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы.**

**Летась у краіне было пабудавана 1 млн 780 тыс. кв. метраў індывідуальнага жылля, а за 9 месяцаў сёлета ўзведзена амаль 1,5 млн кв. метраў такога жылля, паведаміў журналістам начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.**

Паводле слоў спецыяліста, на пачатак кастрычніка ў краіне існуе каля 22 тысяч зямельных участкаў, якія прапануюцца насельніцтву для будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў. Разам з тым сёння толькі каля 2 тысяч нашых суайчыннікаў, што маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, знаходзяцца на зямельным уліку ў выканкамах і збіраюцца будаваць індывідуальнае жыллё.

Летась па лініі індывідуальнага будаўніцтва жылля грамадзянам было прадастаўлена 7200 зямельных участкаў, у тым ліку для «чаргавікоў» — каля 5 тысяч надзелаў. А вось сёлета тэмпы прадастаўлення зямельных участкаў для будаўніцтва індывідуальнага жылля істотна знізіліся. Аляксандр Горваль лічыць, што сёлетняе зніжэнне актыўнасці патэнцыяльных забудоўшчыкаў звязана з тым, што для тых, хто не мае патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, участкі сёння неабходна набываць выключна на аўкцыёнах, а таксама з тым, што большасць участкаў, што прапануюцца, знаходзіцца ў не заўсёды ліквідных раёнах і часта з неразвітой інфраструктурай.

Развіццё новых раёнаў перспектыўнай жыллёвай забудовы вырашаецца шляхам будаўніцтва на гэтых тэрыторыях інжынерна-транспартнай інфраструктуры. Сёлета з бюджэтаў усіх узроўняў накіравана на развіццё інфраструктуры 750 млрд рублёў, з якіх за 9 месяцаў года ўжо рэалізавана 93 працэнты фінансавых сродкаў. Відавочна, што цяпер на гэтыя мэты трэба шукаць дадатковае фінансаванне.

Каб больш актыўна развівалася індывідуальнае будаўніцтва, зацікаўленымі міністэрствамі прапануецца ажыццявіць дэмакратызацыю падыходаў выдзялення зямельных участкаў насельніцтву. Паводле меркаванняў спецыялістаў Мінбудархітэктуры, аўкцыённы продаж участкаў істотна затармазіў працэс атрымання зямлі «жыллёвым індывідуалам», таму прапануецца адмовіцца ад аўкцыёнаў для ўсіх катэгорый грамадзян, пакінуўшы іх толькі для вострадэфіцытных тэрыторый у сталіцы і абласных цэнтрах, дзе існуе перспектыва буйной забудоўлі. На іншых тэрыторыях прапануецца даваць участкі бясплатна ці па кадастравым кошце.

**Намеснік начальніка ўпраўлення землеўпарадкавання і дзяржаўнага кантролю за аховай і выкарыстаннем зямель Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Ігар ПЕТРУСЕНКА** пацвердзіў, што спецыялістамі камітэта падрыхтаваны прапановы па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў ва Указ № 667. Новаўвядзенні дазваляюць маючым патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў набываць зямельныя ўчасткі для будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў на выбар: або ў пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну, ва ўласнасць ці ў арэнду. Прадастаўленне зямельных участкаў у пажыццёвае валоданне з правам перадачы ў спадчыну прапануецца ажыццяўляць бясплатна. Улічваючы той факт, што перадача ва ўласнасць і арэнду зямельных участкаў з'яўляецца платным правам, то зямлю ў гэтых выпадках прапануецца прадастаўляць па кадастравым кошце. А вось для нечаргавікоў павінен захавацца прынцып аўкцыённага продажу і перадачы зямельных участкаў у арэнду.

**Галоўны эканаміст аддзела ўпраўлення рэгулявання крэдытна-фінансавых інструментаў галоўнага ўпраўлення рэгулявання банкаўскіх аперацый Нацыянальнага банка Беларусі Сяргей АНЦІ** паведаміў журналістам, што апошнім часам многія банкі краіны павышаюць працэнтныя стаўкі па крэдытах для насельніцтва. Так, па рублёвых крэдытах на будаўніцтва, набыццё і рэканструкцыю жылля працэнтныя стаўкі вагаюцца ад 16 да 23, а па валютных крэдытах — ад 14 да 17 працэнтаў. Чаму так адбываецца? Справа ў тым, што сёння ў камерцыйных банкаў не хапае фінансавых рэсурсаў. Спецыяліст Нацбанка запэўніў, што цяпер галоўны банк краіны ажыццяўляе шэраг мерапрыемстваў па пошуку для банкаў танных рэсурсаў на мэты жыллёвага крэдытавання насельніцтва, у прыватнасці, праз механізм павелічэння статутных фондаў банкаў і прыцягвання недарагіх замежных інвестыцый.

Сяргей Анці ўдакладніў, што па лініі льготнага крэдытавання будаўніцтва жылля аб'ём фінансавання на 2009 год застаецца ў раней запланаваных памерах. Увогуле праграма будаўніцтва жылля ў нашай краіне застаецца прыярытэтным напрамкам і будзе і надалей фінансавацца ў поўным аб'ёме, паведаміў спецыяліст Нацбанка.

### ДА 2015 ГОДА Ў СТАЛІЦЫ БУДЗЕ ЗНЕСЕНА КАЛЯ 5 ТЫСЯЧ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ДАМОЎ

**Аб гэтым журналістам паведаміў начальнік упраўлення рэгулявання забудовы Камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама Аляксей ВАГА.**

Сёння доля сядзібнай забудовы ў сталіцы складае больш як 25 працэнтаў ад усёй плошчы жыллёвых зонаў. У Мінску каля 17 тысяч прыватных домаўладанняў. У першую чаргу рэканструкцыя жыллёвых масіваў закране індывідуальных домаўладальнікаў па вуліцы Арлоўскай і мікраараён Грушаўкі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ЛЮБОЎНЫ ЗАБЕГ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Учора ў сталічным кінатэатры «Перамога» ўпершыню ў Беларусі адбыліся, напэўна, адны з самых незвычайных спаборніцтваў у свеце — забег паўзункоў да 11 месяцаў ад дня нараджэння.**

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Аляксея Баталава з 80-годдзем

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста СССР Героя Сацыялістычнай Працы Аляксея Баталава з 80-годдзем. «Вы належыце да той бліскучай плеяды вялікіх майстроў экрана і сцэны, дасягненні якіх — гордасць сучаснай культуры. Больш як за паўстагоддзе плённай працы Вамі створана цэлая галерэя незабыўных вобразаў мужных, мэтанакіраваных і моцных духам людзей у цудоўных фільмах, якія ўвайшлі ў залаты фонд савецкага і расійскага кіно», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што беларускія гледачы цэняць і паважаюць Аляксея Баталава «як выдатнага артыста нашага часу, чалавека надзвычайнага і шматграннага таленту, мастацтва якога пераадольвае межы, збліжае краіны і народы».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЯ ЗБІРАЕЦЦА ПАТРАБАВАЦЬ З УКРАІНЫ ЗА ГАЗ $2,4 МЛРД

**Доўг Украіны за пастаўлены з Расіі газ неабходна спагнаць у добраахвотным або прымусовым парадку. Аб гэтым заявіў прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў на сустрэчы з кіраўніком «Газпрама» Аляксеем Мілерам.**

Мілер расказаў Мядзведзеву, што доўг Украіны перад Расіяй складае 2,4 мільярда долараў. Між тым «Нафтагаз Украіны» 20 лістапада праз украінскую прэсу ўжо заявіў, што нічога не павінен «Газпраму». Па звестках украінскага боку, у кампаніі маецца запазычанасць толькі перад кампаніяй-пасрэднікам RosUkrEnergo — 1,26—1,27 мільярда долараў.

### 25 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ ЗА СУПЕРТАНКЕР

**Піраты, якія захапілі саудаўскі супертанкер «Сірыус Стар», запатрабавалі за яго выкуп у 25 мільёнаў долараў.**

«Мы патрабуем 25 мільёнаў ад уладальнікаў танкера. Мы не хочам, каб гэтае пытанне вырашылася ў выніку доўгіх перамоў», — заявіў AFP пірат Махамед Саід з борта судна. Ён заявіў, што выкуп павінен быць заплачаны ў 10-дзённы тэрмін. «Інакш мы прымем жудасныя меры», — дадаў пірат. «Сірыус Стар» быў захоплены 15 лістапада каля берагоў Кеніі. На борце знаходзяцца 25 маракоў з Харватыі, Вялікабрытаніі, Філіпін, Польшчы і Саудаўскай Аравіі. На танкеры можа знаходзіцца груз нафты коштам звыш 100 мільёнаў долараў.



### РАДА ПРАВАЛІЛА ВЫБАРЫ СПІКЕРА

**Вярхоўная Рада на пасяджэнні 20 лістапада так і не змагла абраць спікера.**

За прапанову прыступіць да разгляду гэтага пытання прагаласавалі ўсяго 78 дэпутатаў з 439, зарэгістраваных у зале. Пасля гэтага было прынята рашэнне, што дэпутаты разыдуцца для працы ў камітэтах і вернуцца на наступнае пленарнае пасяджэнне 2 снежня. Былы старшыня Рады Арсень Яценюк быў адпраўлены ў адстаўку 12 лістапада па ініцыятыве дэпутатаў з Партыі рэгіёнаў і пры падтрымцы часткі прапрэзідэнцкай фракцыі НУНС.

### ЗА БАРЭЛЬ НАФТЫ — 50 ДОЛАРАЎ

Кошт на нафту паўночнаморскай маркі Brent знізіўся ў Лондане ніжэй за 50 долараў за барэль, які з мая 2005 года знаходзіцца на мінімуме. Прычынай зніжэння кошту стала турбота інвестараў з нагоды попыту на нафту. Барэль Brent патаннеў на 3,18 долара да 48,54 долара. Адначасова нафта амерыканскай маркі WTI знізілася на 1,86 долара да 51,76 долара за барэль. Учора ўвечары барэль WTI таксама прабіў 50-доларавую адзнаку. Deutsche Bank апублікаваў прагноз, паводле якога кошт на нафту панізіцца да красавіка 2009 года да 40 долараў за барэль.

### П'ЯНЫ ЭСТОНЕЦ САПСАВАЎ СЕМ КІЛАГРАМАЎ КАПУСТЫ

У гандлёвым цэнтры ў Тарту быў затрыманы нецвярозы пакупнік, які браў бруднымі рукамі квашаную капусту, якая прадавалася ў магазіне, і еў яе. Мужчыну затрымалі ахоўнікі. Ён растлумачыў ім, што проста хацеў пакаштаваць капусту перад пакупкай. За псаванне тавару пакупніка перадалі паліцыі. З продажу давялося выключыць сем кілаграмаў капусты на суму каля ста крон (каля васьмі долараў).

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ДЗЕЦІ ПРАВАЛІЛІСЯ ПАД ЛЁД

**Трагічнае здарэнне адбылося ў сераду каля адзінаццаці дня на вадасховішчы паблізу вёскі Рудня Слуцкага раёна: тонкі лёд не вытрымаў малых.**

У вадзе апынуліся двое хлопчыкаў, абодвум — па восем гадоў. Адзін з іх — жыхар Мінска, другі — Баранавічаў, а прыехалі дзеці сюды на аздараўленне ў дзіцячы санаторый «Сонейка». На жаль, выратавацца хлопчыкам не ўдалося. На падставе гэтага факта ўзбуджана крымінальная справа паводле артыкула аб службовай халатнасці, якая пацягнула па неасцярожнасці смерць чалавека.

### ЗАРАБІЎ...

**Тры гады абмежавання волі за ўхіленне ад платы мытных плацяжоў і яшчэ год за падробку афіцыйнага дакумента і паўторнае выкарыстанне заведама фальшывага дакумента — вось як суд ацаніў аўтабізнэс «з хітрынкай» жыхара Астравецкага раёна.**

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, крымінальная справа ў дачыненні да прайдзісвета была ўзбуджана Смаргонскім міжрайаддзелам фінансавых расследаванняў. Як высветлілася, дзялок пры садзейнічанні іншых асобаў у 2004—2005 гадах увёз на тэрыторыю нашай краіны з Літвы праз прапускныя пункты «Каменны Лог» і «Лоша» Ашмянскай мытні 19 аўтамабіляў. Прычым аўтамабілі «Мерседэс», «БМВ», «Поршэ», «Аўдзі» ён увозіў, выкарыстоўваючы рэгістрацыйныя нумарныя знакі і тэхпашпарты іншых аўто, што былі зарэгістраваныя ў Беларусі. З дапамогай такога «манеўру» ён «зэканоміў» на мытных плацяжах... 692 мільёны 700 тысяч рублёў. Між іншым, акрамя таго, што прайдзісвету давядзецца забыць на пэўны час аб вольным жыцці, з яго яшчэ вырашана спагнаць на карысць мытні 692,7 мільёна рублёў, а таксама 34,6 мільёна рублёў дзяржпошліны ў даход дзяржавы.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### АДКУЛЬ У БАБУЛІ ЗАВОД?

**Даволі вялікі «міні-завод» па вытворчасці самаробнага спіртнога працаваў у гаспадарчых забудовах ля хаты ў вёсцы Ветахмо Докшыцкага раёна, дзе жывуць 70-гадовая бабуля і яе 40-гадовы сын. Супрацоўнікі міліцыі здзівіліся маштабам вытворчасці.**

Уявіце сабе — працавалі дзве пары катлоў аб'ёмамі па 200 і 300 літраў, такое ж гіганцкае прыстасаванне для ахаладжэння ёмістасцяў. Каля забудоў знаходзілася яшчэ большая ёмістасць — аб'ёмам у 2000 літраў з брагай. Канфіскавалі 220 літраў самагоннай брагі, якую знішчылі, завод дэманціравалі...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ЧАСОВА ЛЕПШ ВЫБРАЦЬ ІНШЫ ТРАНСПАРТ

**У сувязі з рамонтам моста на перагоне Міханавічы — Рудзенск скразнога руху прыгарадных электрацягнікоў ад станцыі Мінск да станцыі Асіповічы з 7 гадзін 27 лістапада да 3 гадзін 30 хвілін 28 лістапада не будзе.**

Як паведамілі ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, электрацягнікі адпраўленнем са станцыі Мінск—Пасажырскі і прыпыначнага пункта Інстытут культуры будуць ісці да станцыі Міханавічы і назад, электрацягнікі адпраўленнем са станцыі Асіповічы — да станцыі Рудзенск і назад. Перавозіць пасажыраў паміж станцыямі Міханавічы і Рудзенск будуць аўтобусамі па чыгуначных білетах. Да ведама: на прыпыначныя пункты Седча, Зазерка, Рыбцы, Раўнаполле аўтобусы заходзіць не будуць. 28 лістапада электрацягнік Пухавічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем на 5.13 адменены.

Як папярэджваюць чыгуначнікі, ва ўказаныя дні лепш устрымацца ад паездак на электрацягніках, скарыстаўшы магчымасці іншых відаў транспарту. У адваротным выпадку варта памятаць, што па вышэйзгаданай прычыне працягласць падарожжа ў гэтыя дні можа павялічыцца на дзве і больш гадзіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### НЯПОЎНАГАДОВАЯ БЕЛАРУСКА ВЫРАШЫЛА ВЯРНУЦЦА З ЗША

**Няпоўнагадовая беларуская грамадзянка Таццяна Казыра, якая знаходзіцца ў ЗША, вырашыла вярнуцца ў Беларусь. Аб гэтым прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў паведаміў, адказваючы на пытанне прадстаўнікоў СМІ.**

Ён расказаў, што ў Міністэрства замежных спраў паступіла афіцыйная заява Надзеі Пятроўны Новік, бабулі і апекуна Таццяны Казыры, у якой змяшчаецца просьба прыняць неабходныя меры па найхутчэйшым вяртанні Таццяны ў Рэспубліку Беларусь. Надзея Пятроўна пацвярджае, што Таццяна прыняла адназначнае рашэнне вярнуцца на радзіму.

Андрэй Папоў праінфармаваў, што, нягледзячы на забарону сям'і Запата, прадстаўніку МЗС удалося звязацца па тэлефоне з Таццянай, якая пацвердзіла яму сваю настойлівую просьбу дапамагчы ёй як мага хутчэй вярнуцца дадому.

**БЕЛТА.**


БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует, что с 21 ноября 2008 года повышает процентную ставку по срочному банковскому вкладу

«ПРЕСТИЖ»

в российских рублях

**до 13 процентов годовых.**

Установленная процентная ставка применяется с 21 ноября 2008 года как по вновь принимаемым, так и по ранее принятым вкладам.

Срочный банковский вклад

«ПРЕСТИЖ»

- Срок хранения вклада — 3 месяца.
- Фиксированная ставка
  - в белорусских рублях — 15 % годовых,
  - в иностранной валюте (долларах США и евро) — 11,5 % годовых,
  - в российских рублях — 13 % годовых.
- Ежемесячная капитализация дохода и возможность его выплаты.
- Минимальная сумма для открытия вклада в белорусских рублях — 100 000 рублей, в иностранной валюте — сумма не ограничена.
- Вклад вносится наличными денежными средствами либо безналичным перечислением в белорусских рублях, долларах США, евро или российских рублях.
- Возможность пополнения вклада.
- Вклад может быть открыт на имя другого лица.

*Наш «Престиж» — Ваш доход!*

***Дополнительную информацию по размещению денежных средств на банковские вклады можно получить в любом учреждении банка или на сайте***

**http://www.belarusbank.by**

**Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2007 г., млн. белорусских рублей.**

| | январь | февраль | март | апрель | май | июнь | июль | август | сентябрь | октябрь | ноябрь | декабрь | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вклады до востребования | 20,3 | 62,4 | 149,7 | 238,4 | 148,6 | 193,3 | 202,6 | 233,2 | 244,1 | 365,5 | 397,0 | 29 577,5 | 31 832,6 |
| в том числе: в белорусских рублях | 19,4 | 59,3 | 146,3 | 234,1 | 142,4 | 187,7 | 196,5 | 222,2 | 237,7 | 355,5 | 388,0 | 29 408,3 | 31 597,5 |
| в иностранной валюте | 0,9 | 3,1 | 3,4 | 4,3 | 6,2 | 5,6 | 6,1 | 11,0 | 6,4 | 10,0 | 9,0 | 169,2 | 235,1 |
| Срочные депозиты | 30 358,5 | 32 352,4 | 24 405,4 | 38 746,0 | 48 555,5 | 31 125,0 | 54 036,6 | 38 911,9 | 30 223,7 | 55 111,0 | 42 713,9 | 52 150,6 | 478 690,4 |
| в том числе: в белорусских рублях | 26 895,8 | 28 068,5 | 20 038,5 | 29 455,9 | 42 531,2 | 25 248,9 | 42 908,6 | 32 018,1 | 23 385,1 | 42 826,4 | 34 573,9 | 35 011,8 | 382 962,8 |
| в иностранной валюте | 3 462,7 | 4 283,9 | 4 366,9 | 9 290,1 | 6 024,3 | 5 876,1 | 11 128,0 | 6 893,8 | 6 838,6 | 12 284,6 | 8 140,0 | 17 138,8 | 95 727,6 |

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*


«Белсаюздруку» — 90!

## «МЫ ВЫКОНВАЕМ САЦЫЯЛЬНА-ЗНАЧНУЮ РОЛЮ — ДАНОСІМ НАВІНЫ ДА ЛЮДЗЕЙ»



1

**...Прайшло ўжо некалькі гадоў, як я пераехаў у новы спальны мікраараён, у доўгачаканую навабудоўлю. Настальгіі па месцы, дзе пражыў дзесяць гадоў, няма. Але часам, калі згадваецца нешта добрае, дык гэта... кіяскёр газетнага шапіка ў двары дома. За адносна кароткі тэрмін іх змянілася з паўтузіна, пакуль не з'явілася тая жанчына. Не буду гаварыць пафасныя словы адносна прызвання, аднак такога стаўлення да сваёй працы асабіста мне больш бачыць пакуль не даводзілася. Ля кіёска — як своеасаблівага клуба па інтарэсах — заўсёды былі людзі, яны часам проста спыняліся, каб пагутарыць з яго гаспадыняй. Кіяскёр заўсёды нейкім чынам беспамылкова ўгадвала: каму і што прапанаваць. Я быў у гэтым шапіку пастаянным кліентам. Калі раніцай ішоў на працу, мяне ўжо чакаў загадзя падрыхтаваны стос газет. Калі кіяскёра некуды выклікалі і шапік зачыняўся, яна прасіла прадаўцоў з магазіна насупраць перадаць мне перыёдыку і тыя пільнавалі мяне ў акне. А грошы я аддаваў ужо ўвечары або назаўтра. Калі па нейкіх прычынах газеты забірала жонка, яна заўсёды шчыра цікавілася: ці не здарылася што. Калі мы пераязджалі, з жонкай завіталі не да суседзяў, а купілі набор шакаладу і пайшлі развітвацца з гэтай жанчынай, падзякаваць ёй. Я абяцаў, што калі-небудзь напішу пра яе як пра вельмі цудоўнага чалавека і работніка. Няхай і са спазненнем, але я выканаў тое абяцанне...**

Упэўнены, што і многія іншыя мінчане могуць сказаць аналагічныя словы ўдзячнасці ў адрас «свайго» кіяскёра. Выпадковы чалавек у гэтай прафесіі надоўга не затрымаецца, паколькі яму даводзіцца мець справу не толькі з «жывым» друкаваным словам, але і з жывымі людзьмі. Кіяскёр — а гэта ў ста працэнтах заўсёды жанчына — адначасова і прадавец, і касір, і бухгалтар, і прыбіральшчыца, і рамонтнік, калі спатрэбіцца, і псіхолаг, калі пажадаеце.

— Сапраўды, напэўна, толькі жанчыне па сілах адначасова выконваць столькі функцый адначасова, — пагаджаецца начальнік аддзела арганізацыі гандлю РУП «Белсаюздрук» Аксана Валгай. — Напрыклад, у 5.30—6 гадзін адчыніць кіёск, прыняць першую пошту, а ў 6—6.30 ужо абслугоўваць першых пакупнікоў. У 12—13 гадзін — другая прыёмка пошты. І так кожны дзень, каб гараджане мелі магчымасць чытаць свежую перыёдыку. Ветэраны прыгадваюць, што некалі кіяскёрам працаваў адзін мужчына, але, відаць, не вытрымаў нагрузак (*смяецца*), не хапіла цярплівасці.

***(Заканчэнне на 6-й стар.)***





2

Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.





3

**На здымках:**

**1. Дырэктар РУП «Белсаюздрук» Ігар ДУДЗІЧ.**

**2. Начальнік аддзела арганізацыі гандлю Аксана ВАЛГАЙ знаёміць з новымі формамі кіёскаў, якія ў апошні час з'явіліся на вуліцах Мінска.**

**3. Інспектар Кастрычніцкага раёна Мінска Аксана ЧАРКАС — дасведчаны знаўца ў распаўсюджванні газет і часопісаў.**

Спорт-тайм

## На матч Кіпр—Беларусь быў прададзены 91 білет

Зборная Беларусі па футболе завяршыла сезон таварыскім матчам супраць каманды Кіпра, які прайшоў 19 лістапада ў Нікосіі. З лікам 2:1 беларусы прайгралі. Галы ў складзе гаспадароў забілі Дзімітрыс Хрыстофі і Андрэас Аўраам, у гасцей вызначыўся Леанід Ковель. Галоўны трэнер зборнай Беларусі Бернд Штанге так пракаментаваў паражэнне сваёй каманды: «У нас быў эксперыментальны склад. Адсутнічала некалькі важных футбалістаў. У прыватнасці, я не мог разлічваць на гульцоў БАТЭ. Я расстроены, што не ўдалося выйграць. Але часам мы паказвалі нядрэнны футбол. У нас былі моманты, якімі мы, на жаль, не змаглі скарыстацца».

Матч зборных Кіпра і Беларусі праходзіў амаль у поўнай цішыні. Падчас тэлетрансляцыі было заўважна, што трыбуны практычна пустыя. Тэлегледачы маглі нават разабраць каманды, якія даваў Бернд Штанге сваім футбалістам. Як паведамляюць кіпрскія СМІ, на гэты матч быў прададзены ўсяго 91 білет. Такая нізкая цікавасць вельмі здзівіла кіраўнікоў кіпрскага футбола.

У сераду сустрэліся і маладзёжныя каманды абедзвюх краін (узрост гульцоў да 21 года). З лікам 2:0 перамаглі госці (Драгун, 12, Варанкоў, 89).

## МТЗ-РІПА — у Кубку Садружнасці

МТЗ-РІПА выступіць на XVII міжнародным турніры Кубка чэмпіёнаў Садружнасці краін СНД і Балтыі, які пройдзе ў Маскве з 17 па 25 студзеня гэтага года. Бронзавы прызёр чэмпіянату Беларусі атрымаў такую магчымасць па прычыне адмовы ад удзелу ў міжнародных спаборніцтвах чэмпіёна краіны БАТЭ і віцэ-чэмпіёна — мінскага «Дынама».

ISSN 1990 - 763X

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.11.2008 г. (для б/н разлікаў)***

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 146,00 |
| 1 еўра | 2 685,93 |
| 1 латвійскі лат | 3 786,17 |
| 1 літоўскі літ | 777,54 |
| 1 чэшская крона | 104,55 |
| 1 польскі злоты | 695,89 |
| 1 расійскі рубель | 77,83 |
| 1 украінская грыўня | 346,13 |

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 27,5715 |
| 10 UAH | 34,4975 |
| 1000 BYR | 12,8718 |
| EUR | 44,6502 |

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 20.11.2008 г.)***

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

# Для ўсіх сілавых ведамстваў Беларусі ўстанаўліваецца адзіны парадак распараджэння маёмасцю, што вызваляецца

**Для ўсіх воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый Беларусі ўстанаўліваецца адзіны парадак распараджэння матэрыяльнымі рэсурсамі, што вызваляюцца. Адпаведны Указ № 626 аб удасканаленні парадку распараджэння вызваляемымі матэрыяльнымі рэсурсамі Узброеных Сілаў, іншых войскаў, воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый Беларусі Прэзідэнт Беларусі падпісаў 18 лістапада.**

У прыватнасці, рэалізацыя на выплатнай аснове вызваляемых матэрыяльных рэсурсаў Узброеных Сілаў, іншых войскаў, воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый ажыццяўляецца ўпаўнаважанай арганізацыяй — рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «Белспецкантракт» дзяржаўнага гандлёва-вытворчага аб'яднання «Белрэсурсы».

Грашовыя сродкі, атрыманыя ад рэалізацыі гэтых рэсурсаў, будуць пералічацца ў даход рэспубліканскага бюджэту і выкарыстоўвацца на ўтрыманне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый.

Практычная рэалізацыя ўказа будзе садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці распараджэння вызваляемымі матэрыяльнымі рэсурсамі сілавых ведамстваў, растлумачылі ў прэс-службе.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Васіль СПІРЫДОНАЎ:
# «ПЕРААДОЛЕЦЬ СІНДРОМ ПЕРШАКЛАСНІКА»

Чацвёртае паражэнне запар пацярпелі мінскія дынамаўцы ў чэмпіянаце Кантынентальнай хакейнай лігі.19 лістапада каманда саступіла чэмпіёну Расіі «Салавату Юлаеву» з лікам 1:3. У чатырох выязных матчах дынамаўцы набралі два ачкі, 13 лістапада саступіўшы ў Мыцішчах «Атланту» — 1:2 (у овертайме), 15 лістапада ў Магнітагорску «Металургу» — 3:4 (па булітах), 17 лістапада ў Чалябінску «Трактару» — 2:5 і 19 лістапада «Салавату Юлаеву». Пасля выязных матчаў галоўны трэнер мінскага клуба Васіль Спірыдонаў сустрэўся з журналістамі і даў ацэнку выступленню каманды.

«Паездка была складаная — сустракаліся з камандамі, якія ў сваіх дывізіёнах займаюць першыя месцы. Камусьці можа здацца, што 2 ачкі з 12 магчымых, гэта надзвычай мала. Але я бачу, што каманда б'ецца, стараецца, па арганізацыі гульні мы ідзём у правільным накірунку», — заявіў галоўны трэнер. Васіль Спірыдонаў адзначыў, што ў матчах з «Металургам» і «Трактарам» дынамаўцы цалкам правалілі першыя перыяды і назваў гэта «сіндромам першакласнікаў», якія не вытрымалі атмасферы на трыбунах, дзе балельшчыкі актыўна хварэлі за расійскія каманды. Наракаў трэнер і на судзейскія памылкі. «Па некаторых матчах у мяне няма заўваг, а вось у матчы з «Трактарам» судзейства было агіднае. Засмучае той факт, што на матчы з «Дынама» ставяць судзіць навічкоў». Васіль Спірыдонаў зазначыў, што яго падапечныя не гатовыя пакуль гуляць у большасці, хакеісты страчваюць ініцыятыву і нават прапускаюць. Перад серыяй хатніх матчаў галоўны трэнер плануе папрацаваць над гэтым кампанентам, а таксама псіхалагічна падвесці каманду да разумення таго, што можна выйграць у любога саперніка. Чарговыя хатнія матчы мінскага «Дынама» адбудуцца 24 лістапада (супраць чалябінскага «Трактара»), 27 лістапада (супраць уфімскага «Салавата Юлаева» і 29 лістапада (супраць магнітагорскага «Металурга»).

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## Абзац

■ **Першая ў Беларусі школа кулінарнага майстэрства пачне працаваць у Слуцку, на базе мясцовага каледжа перапрацоўчай прамысловасці. На цырымонію адкрыцця запрошаны кіраўнікі вядучых рэстаранаў і гасцінічных комплексаў Беларусі. Галоўнай задачай школы стане перападрыхтоўка прафесійных кухараў, занятых у рэстаранным і гасцінічным бізнэсе. Занятні і майстар-класы са слухачамі будуць праводзіць вядучыя спецыялісты з Масквы.**

■ У Беларусі міграцыйны прырост за студзень—верасень г.г. склаў 4 тыс. 650 чалавек. У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года гэты паказчык павялічыўся на 45 працэнтаў. За 9 месяцаў у Беларусь прыбылі 11 тыс. 514 чалавек, а выехалі за межы рэспублікі 6 тыс. 864 чалавекі.

■ **Пажарныя хутка ліквідавалі ўзгаранне ў будынку Магілёўскага абласнога ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Ачаг узгарання быў у падвале, дзе загарэлася смецце. Паводле папярэдняй версіі, прычынай магло стаць кароткае замыканне. Ад пажару не пацярпелі ні людзі, ні будынак.**

■ У Лондане на 51-м годзе жыцця пасля перанесенага інсульту памёр былы міністр фінансаў, экс-віцэ-прэм'ер РФ Барыс Фёдараў. Тры тыдні таму ён браў удзел у эканамічным форуме ў Англіі. Пасля заканчэння мерапрыемства ён вырашыў дабрацца да гатэля пешшу. Аднак на вуліцы яму стала дрэнна, і людзі выклікалі «хуткую». Фёдараў перанёс дзве складаныя аперацыі, родныя перавялі яго ў адну з самых дарагіх клінік, але ўсе намаганні аказаліся марнымі. У яго засталіся жонка і трое дзяцей, малодшаму з якіх няма і 6 гадоў.

## Поўны абзац

■ **У цэнтры Масквы адбылося незвычайнае, па прызнанні службы бяспекі руху, ДТЗ з удзелам трох іншамарак. Справа ў тым, што за рулём усіх трох машын, што сутыкнуліся на скрыжаванні, былі жанчыны. Дзяўчына, якая кіравала аўтамабілем Ford Fiesta, і кіроўца Dodge сцвярджалі, што ехалі на зялёнае святло святлафора. Трэцяя ўдзельніца ДТЗ, якая ехала на Ford Focus, дысцыплінавана стаяла на скрыжаванні. Віноўніцу ўстановяць інспектары групы разбору.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ДЗЕ МАЁ САЛА?

Адказ на гэтае пытанне 63-гадовы жыхар вёскі Любань Акцябрскага раёна цяпер шукае разам з міліцыяй. Невядомы забраўся да яго ў дом і непрыкметна выкраў 15 кілаграмаў сала і 10 кілаграмаў мяса. А вось у Жыткавіцкім раёне зламыснікам не пашанцавала. Двое непрацуючых і раней судзімых грамадзян спакусіліся на магазін у пасёлку Азёрны. Ноччу сарвалі навясныя замкі і трапілі ў краму, дзе выкралі таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на суму больш за 6 мільёнаў рублёў. Зладзеі, жыхары вёскі Дуброва, 30 і 40 гадоў ад роду, былі затрыманыя разам з часткай выкрадзенага.

У Гомелі невядомы напаў на 24-гадовую прадаўшчыцу прыватнага гандлёвага павільёна па вуліцы Азёрнай. Пад пагрозай прадмета, падобнага на пісталет, забраў 305 тысяч беларускіх рублёў, цыгарэты на мільён беларускіх рублёў і знік на аўтамашыне. Устаноўлена, што злачынства здзейсніў непрацуючы, раней судзімы за крадзеж 28-гадовы жыхар Жлобіна. Ідзе яго вышук.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

*Республиканское унитарное предприятие «Объединенная дирекция строящихся объектов»*

## ПРЕОБРАЗУЕТСЯ В ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО

**в IV квартале 2008 г.**

Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО составляет 222 032 800 рублей;

предполагаемая номинальная стоимость акции создаваемого ОАО 8800 рублей;

предполагаемое количество акций создаваемого ОАО, выделяемых для продажи работникам и приравненным к ним лицам, составляет 25 231 штука.

Принимаются заявления от работников и приравненных к ним лиц (в том числе бывших работников ТРУП «Белартсервис») на:

**— покупку акций ОАО на льготных условиях за деньги (по льготной стоимости);**

**— обмен акций ОАО на именные приватизационные чеки «Имущество».**

***Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Шатько, 24, с 9.00 до 17.00.***

*Тел. для справок:*

***(8017) 226 26 70, 222 19 58, (8029) 331 15 54.***

УНП 190664244.

*По поручению Воложинского райисполкома (арендодатель)*
*КУП «Минский областной центр учета недвижимости»*

## ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

на право заключения договоров аренды земельных участков сроком на 99 лет в Воложинском районе вблизи автомобильной дороги М-6 Минск–Гродно на 50 км – Лот 1 и 63 км – Лот 2 для строительства объектов придорожного сервиса. Площадь земельных участков 0,9000 га и 1,4851 га. Начальная цена права Лота 1 – 8 259 760 рублей, Лота 2 – 3 586 202 рубля.

Аукцион состоится **13.01.2009 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости».

**Участник аукциона, ставший Победителем, обязан:**

**1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении ему земельного участка внести плату за право заключения договора аренды, возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме 22 781 880 руб. (Лот 1), и расходы по подготовке документации (Лот 1 – 2 380 215 руб., Лот 2 – 2 476 406 руб.).**

**2. Заключить с райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить его гос. регистрацию.**

**3. Получить в установленном порядке разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет.**

**4. Снять на занимаемом зем. участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проекту.**

**5. В течение 6 месяцев со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации возникновения права на предоставленный земельный участок приступить к занятию данного участка.**

**6. Осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД.**

Договор аренды заключается в течение 2-х рабочих дней после совершения Победителем аукциона действий, указанных в пункте 1 настоящего извещения. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.01.2009 года** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

# ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

**22 декабря 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит открытый аукцион**

по продаже объекта республиканской собственности, и права заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания – единый предмет аукциона с установлением начальной цены продажи объекта, равной одной базовой величине

**На аукционные торги выставляется:**

| Сведения о капитальном строении и его местонахождении. Продавец недвижимого имущества | Основные характеристики объекта | Площадь земельного участка, отведенного для обслуживания объекта, га | Срок аренды земельного участка, лет | Начальная цена предмета аукциона (объект недвижимости / право аренды земельного участка), руб. | Сумма задатка предмета аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение (магазин) (инв. № 630/С-53777), расположено по ул. Молодежной, 3, в г. Молодечно Минской области<br>ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32», г. Молодечно, ул. Великосельская, тел. (8 01773) 3 19 43, 3 28 56 | Здание одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, крыша рулонная, полы бетонные, имеются инженерные коммуникации. Общая площадь 292,1 кв.м. Год постройки 1982 | 0,0469<br>Арендодатель: Молодечненский райисполком | 99 | Одна базовая величина, установленная на дату проведения аукциона / 8 078 888 | 800 000 |

Направление использования земельного участка: для содержания и обслуживания здания магазина (решение Молодечненского райисполкома от 11 ноября 2008 г. № 855).

**Условия участия в аукционных торгах:** осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте; создание покупателем не менее 3 рабочих мест; запрещена продажа покупателем, иное отчуждение объекта до выполнения им условий договора купли-продажи.

**К участию в аукционных торгах допускаются** негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, заявление на участие в аукционе, подписавшие соглашение о правах и обязанностях сторон, по форме, со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**1. Молодечненский райисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.**

**2. Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.**

**3. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона по 30 декабря 2008 г.**

Порядок проведения аукциона определен Указом Президента Республики Беларусь от 27 февраля 2007 г. № 108 и Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел. 224 57 09, 500 45 08.**
**Последний день подачи заявок 18 декабря 2008 г. до 13.00.**

*Ленинский сельский исполнительный комитет Чечерского района Гомельской области*

## ОБЪЯВЛЯЕТ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

**по продаже в частную собственность земельных участков:**

— земельный участок кадастровый номер 325682201101000057, гражданам Республики Беларусь, расположенный по адресу: Гомельская область, Чечерский район, поселок Вознесенский, ул. Центральная, 31 А, площадь 0,1528 га, под строительство и обслуживание жилого дома с ограничением в отношении жилого имущества, находящегося в прибрежных полосах;

— земельный участок кадастровый номер 325682202601000008, гражданам Республики Беларусь, расположенный по адресу: Гомельская область, Чечерский район, поселок Михайловский, 12, площадь — 0,0718 га, под строительство и обслуживание жилого дома с ограничением в отношении жилого имущества, находящегося в прибрежных полосах.

Аукцион состоится **23 декабря 2008 года** в 14.00 по адресу: здание сельсовета, ул. Луговая, 10, поселок Вознесенский, Чечерский район, Гомельская обл.

**Телефоны для справок: 8 02332 9 30 11, 8 029 113 58 43.**

УНН 401150207

# ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

**«22» декабря 2008 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион**

по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности Солигорского района, и права заключения договора аренды земельных участков, необходимых для его обслуживания, составляющих единый предмет аукциона

**На аукционные торги выставляются:**

| | Лот 1 | Лот 2 |
|---|---|---|
| **Предмет аукциона** | Здание гаражей (инв. № 644/С-34888), площадки асфальтобетонной (инв. № 644/С-40595) и право заключения договора аренды земельного участка необходимого для его обслуживания | Подвальное помещение (инв. № 644/D-29910) и право заключения договора аренды в доле земельного участка для его обслуживания |
| **Место нахождения** | Минская область, Солигорский район, р-он станции «Калий-1» | Минская область, г. Солигорск, ул. Заслонова, д. 57 |
| **Начальная цена предмета аукциона, рублей** | **78 792 386** (в том числе: недвижимое имущество – 75 329 546 / право заключения договора аренды земельного участка – 3 462 840) | **142 996 546** (в том числе: недвижимое имущество – 134 370 996 / право заключения договора аренды в доле земельного участка – 8 625 550) |
| **Сумма задатка для участия в аукционе, рублей** | 7 000 000 | 10 000 000 |
| **Характеристика недвижимого имущества** | Общая площадь здания гаражей 459,2 кв.м. Год постройки – 1977. Одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия деревянные, крыша шиферная, полы бетонные, отопление – радиаторы, электроснабжение – открытая проводка. Площадь асфальтированной площадки 1146 кв.м. Также имеется эстакада | Общая площадь 248,4 кв.м. Год постройки – 1984. Стены – железобетонные блоки, перегородки кирпичные, перекрытия — железобетонные плиты, полы бетонные. Имеются инженерные коммуникации: отопление – центральное, электроснабжение – скрытая проводка, водопровод — металлические трубы с распределительным устройством, канализация – чугунные трубы |
| **Земельные участки отведены для содержания и обслуживания отчуждаемых объектов** | | |
| **Информация о земельном участке** | Площадь 0,2291 га, срок аренды земельного участка – 20 лет | Площадь 0,0201 га (2/100 доли в праве на земельный участок площадью 1,0054 га), срок аренды земельного участка – 30 лет |
| **Продавец недвижимого имущества** | Солигорское городское торгово-производственное унитарное предприятие «Солигорскторг», расположенное по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44, тел. (80174) 22 23 53 | Коммунальное унитарное предприятие «Солигорский районный комбинат бытового обслуживания», расположенное по адресу: Минская область, г. Солигорск, ул. Ленина, 51, тел. (80174) 24 77 90 |
| **Арендодатель земельного участка** | Солигорский районный исполнительный комитет | |

К участию в аукционных торгах допускаются: юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заявление на участие в аукционе, заключившие соглашение о правах и обязанностях сторон, по формам, утвержденным постановлением Государственного комитета по имуществу от 23 апреля 2008 г. № 29 «Об утверждении форм документов»;

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

Солигорский райисполком принимает решение о предоставлении победителю аукциона земельного участка в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. В течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.

2. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона по 30 декабря 2008 года.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

**Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел.: 224 57 09, 500 47 10.**
**Последний день подачи заявок: 18 декабря 2008 г. до 17.00.**

# ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

**«23» декабря 2008 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион**

по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности Слуцкого района, и права заключения договоров аренды земельных участков, необходимых для его обслуживания

**На аукционные торги выставляются:**

| | Лот № 1 | Лот № 2 | Лот № 3 |
|---|---|---|---|
| **Предмет аукциона** | **Здание КПП № 2 (инв. № 640/С-27214) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания** | **Здание столовой (инв. № 640/С-21845) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания** | **Здание склада (инв. № 640/С-27232) и право заключения договора аренды земельного участка, необходимого для его обслуживания** |
| **Местоположение недвижимого имущества** | Минская область, г. Слуцк, 1-й пер. Железнодорожный, 10 | Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 317А | Минская область, г. Слуцк, 1-й пер. Железнодорожный, д.10 |
| **Начальная цена предмета аукциона, рублей** | 35 992 740 (в том числе: недвижимое имущество – 27 000 000, право заключения договора аренды земельного участка – 8 992 740) | 226 950 550 (в том числе: недвижимое имущество – 51 000 000, право заключения договора аренды земельного участка – 175 950 550) | 37 710 180 (в том числе: недвижимое имущество – 9 000 000, право заключения договора аренды земельного участка – 28 710 180) |
| **Сумма задатка для участия в аукционе, рублей** | 3 000 000 | 15 000 000 | 3 000 000 |
| **Характеристика недвижимого имущества** | Общая площадь 46,0 кв.м. Одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные, крыша шиферная, полы деревянные, отопление – стальные трубы, чугунные радиаторы, электроснабжение – скрытая проводка, вентиляция естественная. Год постройки – 1975. Имеется дворовое покрытие площадью 70 кв.м | Общая площадь 457,3 кв.м. Одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытие деревянное, крыша шиферная, полы бетонные, дощатые, плиточные, отопление – стальные трубы, электроснабжение — скрытая проводка, водопровод — стальные трубы, канализация – чугунные трубы, горячее водоснабжение – стальные трубы, вентиляция естественно-вытяжная. Год постройки – 1936 | Общая площадь 181,0 кв.м. Одноэтажное, фундамент бутобетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытие деревянное, крыша шиферная, полы бетонные, электроснабжение – открытая проводка, вентиляция естественная. Инженерные коммуникации отсутствуют. Год постройки – 1972 |
| **Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества** | Площадь 0,0338 га. Срок аренды земельного участка – 50 лет | Площадь 0,5997 га. Срок аренды земельного участка – 20 лет | Площадь 0,2193 га. Срок аренды земельного участка – 20 лет. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с расположением его в водоохранной зоне р. Случь |
| **Продавец недвижимого имущества** | Коммунальное унитарное предприятие «Слуцкий комбинат школьного питания», расположенное по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 120, тел. (801795) 24865, 57133 | Отдел образования Слуцкого райисполкома, расположенное по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 189, тел. (801795) 52942 | Торговое унитарное предприятие « Городской центральный рынок г. Слуцка», расположенное по адресу: Минская область, г. Слуцк, 1-й пер. Железнодорожный, д. 10, тел. (801795) 20613 |
| **Арендодатель земельного участка** | Слуцкий районный исполнительный комитет, г. Слуцк, ул. Ленина, 189 | | |

**К участию в аукционных торгах допускаются:** юридические лица, индивидуальные предприниматели, граждане Республики Беларусь и иностранные граждане, представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении, следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, также представитель должен иметь при себе паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации, представителем индивидуального предпринимателя дополнительно представляется нотариально удостоверенная доверенность;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, представителем иностранного юридического лица дополнительно представляется легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, а также паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

гражданином Республики Беларусь и иностранным гражданином – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, представителем гражданина Республики Беларусь и иностранного гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

**ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:**

1. В течение 4 рабочих дней со дня проведения аукциона возмещает расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, вносит плату, взимаемую за право заключения договора аренды. После внесения победителем аукциона названных платежей продавец имущества заключает договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодатель земельного участка – договор аренды земельного участка.

2. Оплата за объекты недвижимости должна быть произведена победителем аукциона по 30 декабря 2008 года.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты проведения аукциона.

Все **расчеты по сумме задатка** производятся путем перечисления их на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» 3642000000028 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.

**Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 312, тел.: 224 57 09, 500 47 10.**
**Последний день подачи заявок: 19 декабря 2008 г. до 16.00.**

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

21 ЛІСТАПАДА 2008 г. ПЯТНІЦА
№ 46 (15550)

Ведай нашых!

## Сярод 15 лепшых прагрaмістаў — двое беларусаў

Выпускнікі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Іван Мяцельскі і Аляксей Тоўсцікаў вельмі паспяхова прадставілі Беларусь на фінальных спаборніцтвах па праграмаванні «Google Code Jam-2008», якія прайшлі ў галоўным офісе фірмы Google (Каліфорнія, ЗША). У гэтых спаборніцтвах могуць браць удзел праграмісты з усіх краін свету, незалежна ад іх адукацыі, цяперашняга статусу і наяўнасці вопыту. Пасля адборачных спаборніцтваў, якія праходзілі ў некалькі этапаў, у фінал выйшлі 100 удзельнікаў. Самую вялікую колькасць сваіх прадстаўнікоў мелі ў фінале Расія (20 чалавек), Кітай (19) і ЗША (15). Беларусь жа прадстаўлялі толькі два ўдзельнікі. Але нашы хлопцы здолелі ў чарговы раз пацвердзіць сусветны ўзровень падрыхтоўкі па праграмаванні, заняўшы 8-е (Іван Мяцельскі) і 13-е (Аляксей Тоўсцікаў) месцы ў асабістым заліку і апярэдзіўшы тых жа расіян, лепшы з якіх заняў 15-е месца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ВНУ будуць «шчыраваць» над новым іміджам

**Да 2010 года ўсе беларускія вышэйшыя навучальныя ўстановы павінны распрацаваць і ўкараніць сістэмы кіравання якасцю адукацыі — такое рашэнне было прынята на пасяджэнні Рэспубліканскага савета рэктараў, прысвечанага пытанням развіцця ўніверсітэцкіх сістэм менеджменту якасці.**

Агульнавядома, што вышэйшая адукацыя стала ў нашай краіне масавай — колькасць студэнтаў дасягнула ўжо 420 чалавек на 10 тысяч насельніцтва. Але такая масавасць ні ў якім разе не павінна шкодзіць якасці адукацыі. Тым больш што ад сістэмы адукацыі залежыць і навуковы патэнцыял краіны, і канкурэнтаздольнасць арганізацый, што працуюць у рэальным сектары эканомікі. Сёння перад вышэйшай школай пастаўлена задача пашырэння экспарту адукацыйных паслуг і выхаду на ўзровень, які адпавядае сусветным стандартам.

Укараненне сістэмы менеджменту якасці — працэс вельмі няпросты, які патрабуе ад ВНУ канцэнтрацыі намаганняў і матэрыяльных выдаткаў. Аднак, на думку першага намесніка міністра адукацыі Аляксандра Жука, сістэма менеджменту якасці выгадна ўсім: на ўзроўні ВНУ яна дазваляе павысіць якасць падрыхтоўкі выпускніка, спрасціць узаемадзеянне паміж падраздзяленнямі ВНУ, матываваць да ўдасканалення сістэмы якасці ўсіх супрацоўнікаў, павысіць адказнасць выкладчыкаў за сваю дзейнасць, палепшыць эканамічную эфектыўнасць дзейнасці навучальнай установы. На рэспубліканскім і міжнародным узроўнях сістэма менеджменту якасці дазваляе спрасціць працэдуры ліцэнзавання, атэстацыі і акрэдытацыі, пашырыць экспарт адукацыйных паслуг, арыентавацца на задавальненне патрэбаў работадаўцаў і павысіць ступень іх даверу да ВНУ. Вельмі важна, каб адукацыйная галіна выпускала патрэбных эканоміцы спецыялістаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Ні пуху, ні пер'я!

Паўфінал студэнцкага чэмпіянату свету па праграмаванні пройдзе на наступным тыдні ў Санкт-Пецярбургу. Прадстаўляць Беларусь на ім будуць шэсць студэнцкіх камандаў: тры каманды БДУ, дзве — Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі і каманда Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Нагадаем, што чвэрцьфінальныя спаборніцтвы Заходняга рэгіёна праходзілі на базе БДУ і сабралі 47 камандаў з Беларусі, Эстоніі, Латвіі, Літвы і Калінінграда. У паўфінал маглі прайсці толькі 13 камандаў, такім чынам беларусы заваявалі амаль што палову пуцёвак. Фінал жа чэмпіянату свету адбудзецца ў красавіку 2009 года ў Стакгольме. Спадзяёмся, што і ў фінальнай частцы спаборніцтваў знойдзецца месца для беларусаў. Тым больш што студэнты БДУ заўсёды дабіваліся права ўдзельнічаць у фінале чэмпіянату свету і нават становіліся яго залатымі прызёрамі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АНДРЭЙКА, ФЁДАР, МІРТУСЯ: ЭКЗАМЕН НА МАЦЯРЫНСТВА — НА «ДЗЯСЯТКУ»

За тыя пяць хвілін, што матуля варыла на кухні кашу, трохгадовы Фёдар паспеў нацягнуць калготы прама на шорты, закруціцца ў плед і ў такім выглядзе здзейсніць некалькі скачкоў з канапы, уяўляючы сябе Бэтманам. Потым ён падляцеў да мяне і папрасіў намаляваць яго ў рабочым блакноце.

— Вось гэта ў Фёдара галава, а гэта — вуха, — старанна вадзіла я ручкай па паперы пад пільнай увагай дзіцячых вачэй. — Колькі ў Федзі вушэй?

— Сем! — не раздумваючы, адказаў хлопчык.

Тым часам дзесяцімесячная Рыта з задавальненнем камячыла сямейныя здымкі, якія матуля па неасцярожнасці расклала на канапе, а вольнай рукой крышыла па пакоі печыва. У рэшце рэшт яна ўпусціла з рота соску, ад гора згубіла раўнавагу, павалілася на падлогу і заплакала.

Кідаючыся ад хлопчыка да дзяўчынкі, я радавалася толькі таму, што старэйшы — пяцігадовы Андрэйка — яшчэ ў садку. І што зусім хутка вернецца з кухні маладая матуля — студэнтка Белдзяржуніверсітэта Алена Сушко, якая не ўяўляе свайго жыцця без гэтай шумнай, але такой вясёлай і такой любімай тройкі.

### На лекцыі — з Андрэйкам

У той вечар Лена збіралася на школьную дыскатэку быццам да шлюбу: сёння яна прывядзе на агледзены да аднакласніц свайго кавалера. Дзяўчына і з аховай дамовілася, каб пусцілі хлопца, і настаўніцу сваю папярэдзіла, і, зразумела, сяброўак. Аднак у вызначаны час кавалер не прыйшоў. Не прыйшоў ён і пазней. Лена адчувала сябе апошняй выхвалякай і праклінала гэты вечар, які, здавалася, быў безнадзейна сапсаваны.

Але яна не была адзінокай у сваёй бядзе. Леанід — хлопец на клас старэйшы — запрасіў на злашчасную дыскатэку малазнаёмую, але вельмі прывабную дзяўчыну, а яна прывяла з сабой яшчэ двух хлопцаў. І Лёню нічога не заставалася, як схавацца ў куток і злавацца на ўвесь свет. Але нават тут яму перашкаджалі: нейкая няўклюдная школьніца ўмудрылася тры разы зачапіцца за яго ногі. У чацвёрты раз ён не вытрымаў, узняў на яе вочы і з азвярэннем запытаўся: «Вы штосьці хацелі?» І адразу прыкусіў язык, бо злавацца на такую прыгажуню, у якой валасы спускаліся ніжэй за вузенькую чорную сукенку, было немагчыма. Вось так яны і пазнаёміліся — Лена і Лёня.

Пераймаючы лепшыя традыцыі кінематографа, два наступныя тыдні падлеткі звярталіся адзін да аднаго толькі на «вы»: «Можна вас сёння правесці?» Цяпер яны са смехам успамінаюць, як манернічалі. Так, пры размове аб адзнаках Лёня скупа прамовіў, што ў яго дзве «чацвёркі», і дзяўчына з гонарам расказвала аднакласніцам, што «гуляе» амаль што з выдатнікам. Не, у хлопца сапраўды было дзве «чацвёркі», і «пяцёркі» таксама дзве, а ўсе астатнія — «тройкі».

Аднак для кахання адзнак не існуе. І калі Лёня пайшоў у армію, Лена страчыла яму лісты, быццам стэнаграфістка, штодня — хлопец і канверты распячатваць не паспяваў. Затое Леніны пасланні адсочвалі іншыя салдаты. «Лёня, — прасілі яны сябра, — дай што-небудзь душэўнае пачытаць!»

Сама дзяўчына тым часам ужо была студэнткай факультэта філасофіі і сацыяльных навук Белдзяржуніверсітэта. Вучылася яна напаўплатна і марыла, як праз некалькі гадоў атрымае дыплом выкладчыка сацыяльна-палітычных навук. Аднак жыццё ўнесла свае карэктывы ў Ленін план кар'ернага росту. Закаханым здавалася, што яны не вытрымаюць паасобку і года. І на другім курсе, адразу пасля летняй сесіі, студэнтка ўзяла шлюб са сваім Леанідам, які вярнуўся з арміі яшчэ больш мужным, са званнем двухразовага чэмпіёна Беларусі па самба сярод ваеннаслужачых. Дзяўчына ніколі не здавала экзамены так добра, як перад сваім вяселлем.

А ў наступным навучальным годзе яны ўжо прыходзілі на лекцыі ўдваіх — Лена і яе будучы сынок Андрэйка. Аднакурсніцы падобраму ёй зайздрасцілі. «Насамрэч абсалютна кожная дзяўчына хоча мець дзіця, — тлумачыць маладая матуля. — Проста некаторыя вельмі глыбока хаваюць гэтае жаданне».

Ва ўніверсітэце заўважылі, што Лена, якая і так славілася як добрая студэнтка, стала вучыцца яшчэ лепей. «Я разважала так: калі буду старанна займацца, то і сын вырасце разумным, — успамінае мая суразмоўца. — Лепшага стымулу і не прыдумаеш!»

Нараджала Лена цяжка, хвіліны цягнуліся — як гадзіны. Ужо ў палаце нянечка запытала ў яе: «Па другога, пэўна, не прыйдзеш?» — «Не прыйду», — пагадзілася з ёй змучаная студэнтачка.

### Фёдара першым узяў на рукі тата

На гэтым цяжкасці не скончыліся: першыя тры месяцы жыцця Андрэйка пакутаваў на дысбактэрыёз. Ён не спаў, крычаў, як рэзаны, і за дзень пэцкаў цэлы стос пялюшак. Шкадуючы стомленую жонку, малады бацька сам браўся за мыццё, а потым выкручваў бялізну ручной машынкай: аб «аўтамаце» не даводзілася нават марыць.

Але праз год Лена неспадзявана выявіла, што ёй не хапае напружанасці: сын падрос, стаў хадзіць на гаршчок і спрабаваў самастойна есці. «Гадаваць дваіх будзе весялей», — вырашылі маладыя бацькі і сталі чакаць дзяўчынку.

Падчас другой цяжарнасці Лена пайшла на спецыяльныя курсы, якія тады толькі-толькі з'явіліся. «Зразумела, не трэба прымаць усе рэкамендацыі блізка да сэрца, інакш вас схіляць да родаў у сваёй ванне», — смяецца студэнтка.



26-гадовая студэнтка БДУ гадуе траіх дзетак і марыць стаць выкладчыкам сацыяльна-палітычных навук

Але некаторыя парады яна ўсё ж такі пераняла. Так, дзеля псіхалагічнай падтрымкі Лена папрасіла мужа быць побач з ёй у родавай. Леанід трымаўся мужна і першым узяў на рукі іх другое немаўля, і трэцяе таксама. Напэўна, таму малодшыя дзеткі даліся Алене куды лягчэй, чым першы сын.

А яшчэ ўсю другую цяжарнасць будучая матуля піла гарбату, завараную на лістах маліны — каб роды былі бязбольнымі. «Гэта добры рэцэпт, шчыра рэкамендую», — кажа Алена.

Шкада толькі, што ніякая гарбата не дапаможа скарэктаваць пол будучага дзіцяці. «У вас будзе хлопчык, — сказалі Алене ў час ультрагукавога даследавання. — Ой, а што з ім здарылася? У яго тахікардыя!» Гэта Лена засмуцілася, што на свет з'явіцца не дзяўчынка, і хваляванне адразу перадалося дзіцяці — такая цесная сувязь паміж матуляй і яе малым!

Фёдара, як і Андрэйку, студэнтка пачала развіваць з нараджэння. Яна малявала і вешала над ложкам чырвоную кветку, белую і чорную палосы — каб хлопчыкі хутчэй вучыліся канцэнтраваць погляд, распазнаваць розныя колеры. А яшчэ Алену можна назваць майстрам калыханкі. «Калі ўсе вядомыя песні мне надакучваюць, я вучу на памяць які-небудзь верш і спяваю яго на свой лад, — раскрывае сакрэт мая суразмоўца. — Я лічу, што ўсе матулі павінны люляць сваіх дзетак, без розніцы, ёсць у іх музычная адукацыя, як у мяне, ці няма, бо калыханка спяваецца не голасам, а душой!»

Гуляючы ў двары са сваімі хлопцамі, Лена ўпершыню спазнала, што такое мацярынскае братэрства. «Маладым матулям не патрэбна нагода для знаёмства, — расказвае студэнтка. — Проста падыходзіш і пытаешся: «А колькі вашаму маламу?» — гэтыя словы быццам пароль, які адчыняе жаночыя сэрцы».

Адно з такіх вулічных знаёмстваў перарасло ў моцнае сяброўства. Новая прыяцелька супадала з Ленай і па ўзросце, і па інтарэсах. Адрозніваліся яны толькі колькасцю дзетак: на той момант, калі Лена яшчэ насіла пад сэрцам Фёдара, яе знаёмая ўжо гадавала траіх. Натхніўшыся яе прыкладам, студэнтка таксама адважылася на трэцяга — нездарма ж кажуць, што Бог любіць тройцу.

### Чыя чарга гуляць з Міртусяй?

Цяпер Маргарыце дзесяць месяцаў, Фёдару тры гады, Андрэю — пяць з паловай. Хлопцы штовечар спрачаюцца, чыя чарга гуляць з сястрычкай, якая атрымала забаўную хатнюю мянушку Міртуся. Андрэй, як старэйшы, саступае. Ён увогуле паводзіць сябе быццам дарослы, а посуд мые нават лепей, чым бацька.

Сам Леанід працуе на заводзе «Атлант». Цікава, што кожны раз з нараджэннем дзіцяці ў яго містычным чынам удвая вырастаў заробак. Але для шматдзетнай сям'і грошай ніколі не бывае многа: толькі памперсы і пральны парашок цягнуць на палову сямейнага бюджэту. Маладыя бацькі вельмі ўдзячныя прафсаюзу Белдзяржуніверсітэта, які двойчы выдзяляў Лене грошы на нараджэнне дзіцяці і кожную зіму радаваў вялікую сям'ю навагоднімі падарункамі.

Але самым лепшым «бонусам» стане для сям'і Сушко свая чатырохпакаёвая кватэра: дзяржава абяцае аплаціць 50 працэнтаў яе кошту і падарыць першы ўзнос. Пакуль жа яны туляцца ў адной кватэры з Лёневым бацькам і сястрой, яе мужам і дачушкай-немаўляткай. Маладыя бацькі і іх трое дзетак спяць у адным пакоі, і калі ноччу Маргарыта плача, хлопчыкі не высыпаюцца таксама.

Але нягледзячы на недахоп сну і бытавыя праблемы, Лена не ператварылася ў затузаную мамку, у якой увесь клопат аб дзіцяці зводзіцца да заўваг — туды не хадзі, гэтага не чапай. Нават аб крывабокіх зорачках, намаляваных алоўкам на кухонных шпалерах, яна адгукаецца з мацярынскай ласкай: «Андрэйка такі шчаслівы быў, калі навучыўся іх маляваць!».

У Лены хапае пяшчоты і на мужа: яна заўсёды знаходзіць хвілінку, каб прыгажэй апрануцца да яго прыходу, прыгатаваць яму нешта асаблівае. Толькі на сябе часу амаль не застаецца. У кіно яна апошні раз хадзіла яшчэ цяжарная Фёдарам. Адзін час дзяўчына нават спрабавала ўставаць ноччу, прымаць ванны з травамі, рабіць маскі, чытаць. Але гэтыя начныя працэдуры толькі падрывалі яе сілы.

Тым не менш маладая матуля не адкладае надзеі аднавіць фігуру да 42-га памеру, як зрабіла гэта пасля нараджэння Фёдара. «Вось учора ўвечары не з'ела піражок — і такой гераіняй сябе адчуваю!» — смяецца студэнтка.

А вось у тым, што ў свае 26 яна спраўляецца з такой вялікай сям'ёй, Алена ніякага геройства не бачыць, маўляў, гэта першы абавязак кожнай жанчыны.

— Лена, якой будзе канчатковая колькасць дзетак? — жартую я.

— Ведаеш, я ў дзяцінстве хвалілася сяброўкам, што буду мець дзесяцярых, — адказвае мая суразмоўца, тулячы да сябе заплаканую Міртусю і вольнай рукой пераапранаючы Фёдара. — І я не супраць, калі б яно так і было. Бо шчасця многа не бывае!

**Вікторыя КРУПЯНЬКОВА.**
**Фота аўтара.**

## Падарунак ад НЛП

**ДАВЕДКА:**

**НЛП (нейра-лінгвістычнае праграмаванне) базуецца на ідэі таго, што свядомасць, цела і маўленне індывідыума фарміруюць карціну яго ўспрымання, і гэтае ўспрыманне і паводзіны можна змяніць з дапамогай розных тэхналогій.**

**Часцей за ўсё выкарыстоўваецца ў рэкламе, бізнэсе, маркетынгу, сферы камунікацый.**

**Кажучы простай мовай, НЛП — гэта здольнасць прымусіць вас думаць так, як трэба суразмоўцу, купляць тое, што вам прадаюць, рабіць тое, чаго ад вас чакаюць.**

Рэкламныя аб'яўкі ў грамадскім транспарце ўмела заклікаюць нас вывучаць мовы, танчыць брэйк-данс, прымаць толькі гэтыя (безумоўна, лепшыя) лекі. Усё гэта мы, як кажуць, «праходзілі».

Але зараз усё часцей трапляюцца на вока таямнічыя і жаданыя словы ПОСПЕХ (толькі вялікімі літарамі), кар'ера, новыя магчымасці і незнаёмая абрэвіятура НЛП — неад'емны складнік поспеху і ўсяленскага шчасця.

Нам абяцаюць, што запісаўшыся на НЛП-трэнінгі, мы адразу станем паспяховымі менеджарамі, рэкламшчыкамі, кансультантамі, кіраўнікамі і г.д.

І вось уявіце сабе: вас, звычайнага чалавека, што ідзе з працы ці ў жаданы выхадны шукае сабе новыя туфлі і нічога пра гэтае НЛП не ведае, знянацку хапае такі паспяховы (ці не надта) кансультант нейкай фірмы. Чапляецца, зазірае ў вочы, працягвае прыгожыя паперкі і пытаецца што-небудзь накшталт: «Вы любіце падарункі?»

Ну хто ж не любіць падарункі! І мы як кітайскія балванчыкі ківаем і слухаем: «Наша кампанія праводзіць акцыю... запоўніце, калі ласка, анкету... атрымаеце падарунак...»

І мы запаўняем, зусім забыўшыся, што нам трэба ісці за неабходнымі туфлямі, бо ў галаве ў нас толькі «падарункі і яшчэ раз падарункі», ды і кансультант гэты даволі мілы, усміхаецца вам, як лепшай сяброўцы. А ў нас не Злучаныя Штаты, у нас проста так не ўсміхаюцца незнаёмцы і прадаўцы вітаюцца толькі ў асобных гіпермаркетах, так што размаўляць з усмешлівым кансультантам вам падабаецца.

І вось мы запаўняем анкетку, добраахвотна «здаёмся» ў палон гэтым «толькі натуральным кампанентам», «высокаму заробку» альбо «новай унікальнай формуле». Пішам на паперку тэлефоны сваіх сяброў і... чуем урачыстае: «Тэлефануйце».

І калі вы ўсё-такі вырашылі патэлефанаваць кансультанту і атрымаць доўгачаканы падарунак, будзьце падрыхтаваныя да таго, што сустрэча — гэта цэлы семінар, на якім вы праслухаеце лекцыю аб ужо вядомых нам «натуральных кампанентах» і г.д.

А тады словы з метрапалітэнаўскіх рэкламак (памятаеце? Поспех, поспех!) закружаць вам галаву і оп-ля — вы ўжо такі ж самы кансультант. Розніца толькі ў тым, што вас працаваць з кліентам яшчэ не вучылі.

Тут могуць быць розныя шляхі далейшага развіцця падзей. Вы можаце заплаціць няшмат і такім жа чынам — няшмат згубіць, а можаце, замарочаныя словамі поспех, грошы аддаць сваіх жа кроўных шмат-шмат-шмат. А вось ці акупіцца ваш уклад у сеткавы маркетынг? Невядома. А спакусы вялікія, прыгожыя словы пра «здзяйсненне мары», «свет магчымасцяў» і (што абавязкова) — фотаздымкі «дружнай каманды», дзе можаце быць і вы, дзесьці ў Швецыі ці Парыжы...

Дык вось... Я пра тое, што вы, набыўшы новыя туфлі, вырашылі закончыць дзень так жа ўдала, патэлефанавалі кансультанту, трапілі ў офіс і... тут пачынаецца (галоўнае праяўляць стойкасць).

— Як! Вы не хочаце зарабляць дадатковыя грошы? Вы не хочаце пабачыць свет? — вельмі натуральна здзіўляецца кансультант і працягвае мне свой фотаальбом.

А я проста хачу забраць свой падарунак. Аб чым жанчыне і заяўляю. Што, прызнаюся, патрабавала ад мяне вядомай мужнасці і адвагі (а таксама псіхалагічнай устойлівасці).

Зразумеўшы, што я не буду кансультантам і не паддамся ўздзеянням НЛП-методык, жанчына паказала мне пералік падарункаў і я ўздыхнула: іх было з паўдзясятка. Невялікі выбар, так?

Атрымаўшы недарагі і не вельмі каштоўны падарунак, я вырашыла бегчы ад усмешлівых і прывабных людзей з анкетамі як мага далей. Парадокс?

Так што ведайце: прычына таго, што вы купілі тое, што вам было зусім не патрэбна, згадзіліся працаваць з тым, што вам не надта і падабаецца, — прыёмы нейра-лігвістычнага праграмавання. Можна гаварыць, што НЛП — гэта маніпуляцыя людзьмі, нават нейкае замбаванне. Кожны для сябе вырашае па-свойму. Але што непахісна, НЛП — гэта такая сістэма: мадэлявання паводзінаў, якая прыводзіць да поспеху. Толькі каго?

Задача звычайнага чалавека, такога, які кожны дзень ездзіць у грамадскім транспарце і бачыць гэтыя аб'яўкі, — ведаць, што такое НЛП, і ўмець ад яго абараніцца.

**Ірына РАМАНІВА.**

## Беларускія школьнікі — зноў лепшыя

19 дыпломаў і некалькі пахвальных водгукаў заваявалі беларускія школьнікі на шостай Міжнароднай алімпіядзе школьнікаў краін СНД і Балтыі, у тым ліку 7 дыпломаў першай ступені. Гэта лепшы вынік на алімпіядзе. На спаборніцтвы прыехалі школьнікі з 14 былых савецкіх рэспублік, а таксама са Злучаных Штатаў Амерыкі, Партугаліі, Румыніі і Польшчы. Алімпіяда праходзіла ў два туры. Першы тур — міжпрадметны. Другі — па прадметах: матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі і рускай мове і літаратуры. Беларускія школьнікі здолелі заваяваць па два дыпломы першай ступені па матэматыцы, фізіцы і хіміі і адзін дыплом першай ступені — па рускай мове і літаратуры. А навучэнец Ліцэя БДУ Арцём Маргуноў прывёз два дыпломы трэцяй ступені: па хіміі і біялогіі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Вадзіцелям на заметку

## ВОСЬ ДЫК «ЧЫХ»!

**Я, як і большасць пасажыраў грамадскага транспарту, заўсёды разглядваю праз шкло вадзіцеляў аўтамабіляў, якія абганяюць мой аўтобус. Яны ж, як мужчыны, так і жанчыны, не ведаючы, што знаходзяцца пад кантролем, спакойна адной рукой трымаюць руль, а другой у гэты час націскаюць кнопкі на тэлефоне ці скідваюць попел з цыгарэты. Складваецца такое ўражанне, што пункт правілаў дарожнага руху, у якім гаворыцца, што «вадзіцель абавязаны не выконваць дзеянняў, якія адцягваюць яго ад кіравання транспартным сродкам», у аўташколах апускаюць. А дарэмна. Менавіта па прычыне няўважлівасці ў сталіцы з пачатку года адбылося больш як 60 дарожна-транспартных здарэнняў.**

### Вам, аўталэдзі!

— Штодзень, адпраўляючы дзіця ў школу, думаю, кожная маці просіць сваіх дзяцей быць уважлівымі на дарозе. Пры гэтым жа самі падчас кіравання машынай разглядваюць свайго «жалезнага каня» ці назіраюць за іншымі вадзіцелямі, — рэагуе на мой ранішні аповед пра нядобрасумленных вадзіцеляў старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе ДАІ Савецкага РУУС горада Мінска Вольга Суворава. — З горыччу даводзіцца таксама бачыць, як жанчына, знаходзячыся за рулём, спрабуе ўмела выруліць з суцэльнага патоку, уплятаючы пры гэтым марожанае (пра сотавы тэлефон ужо і гаварыць не даводзіцца — ён стаў ужо неад'емнай часткай вадзіцеля). Магчыма, яна і віртуоз, але навакольных гэта пужае. Неяк даводзілася бачыць карціну, як жанчына, чакаючы зялёнага сігналу святлафора, знаходзячыся ў патоку, прычым другой па ліку, са спакойным выглядам мазала рукі крэмам. А чаго каштуе малюнак нанясення ранішняга макіяжу і мадэлявання прычоскі. Часам задумваешся: магчыма люстэркі ў салоне прыдумалі касметолагі і цырульнікі, каб нагадаць жанчынам аб наступным наведванні.

### Вам, аўтаджэнтльмены!

Але прадстаўнікам моцнай паловы чалавецтва, якія, безумоўна ж, адчуваюць сябе гаспадарамі дарог, таксама ёсць аб чым задумацца. Паводле статыстыкі, менавіта мужчын штрафуюць больш за ўсё за размовы па тэлефоне. А чаго каштуе курэнне за рулём! Жанчыны пакутуюць ад гэтага радзей, паколькі часцей перавозяць дзяцей, а пасіўнае курэнне, як вядома, яшчэ больш шкоднае, чым актыўнае.

— А колькі разоў была сведкай таго, як мужчыны наладжвалі гонкі на дарозе, звяртаючы пры гэтым увагу толькі на суперніка, ці разглядвалі чужыя аўтамабілі, міжволі параўноўваючы са сваім. І яшчэ, як сказаў адзін мой знаёмы: «Калі б вы, жанчыны, насілі ўвесь час паранджу і штаны, то і мы б глядзелі на праезную частку, а не на тратуары»...

Безумоўна, я ні ў якім разе не адмаўляю таго, што можа існаваць паняцце міжвольнага адцягнення ўвагі, але гэта ў наш час здараецца рэдка. Хоць быў такі выпадак, калі жанчына, кіруючы аўтамабілем, чхнула, выпадкова націснула на педаль газу і ўехала ў машыну, якая стаяла наперадзе.

**Надзея ДРЫЛА.**

# ДЗІЦЯ & КАМП'ЮТАР



**У дзяцінстве мы пасля ўрокаў адразу беглі на двор, гуляць у футбол, даследаваць наваколле, ладзіць тарзанку, гуляць у вайнушку — ой, усяго і не пералічыш! Галоўнае было для нас — не сядзець дома, вырвацца на свежае паветра, да сяброў. І бацькі пад вечар вылазілі ў вокны і гукалі: «Паааавеел!.. Віталя!.. Дадому!..». Ну а мы прасілі яшчэ крыху пагуляць. Здаецца, колькі там часу прайшло, а цяпер у бацькоў новая праблема — як дзяцей выгнаць з дому на двор. Прыходзіць сённяшні школьнік пасля ўрокаў і... садзіцца за камп'ютар. Гульні, інтэрнэт, фільмы,ы чаты, форумы — часу на вуліцу ў дзяцей не застаецца. Калі мы лазілі з цацачнымі пісталетамі па дзіцячых садках і ўцякалі ад вартаўніка, то цяперашняе маладое пакаленне з кулямётамі «валяць» тэрарыстаў па сеціве ў Контар Страйк. Таму калі нашыя бацькі думалі, як засцерагчы нас ад наркотыкаў, алкаголю і цыгарэт, то ў сучасных бацькоў «галава баліць» яшчэ і наконт камп'ютарнай залежнасці. Менавіта і пра гэтае «навамоднае» захворванне мы пагутарым сёння з Алай Гулякевіч, кандыдатам медыцынскіх навук, асістэнтам кафедры дзіцячай псіхіятрыі і псіхатэрапіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі:**

***— Ала Фёдараўна, раскажыце нашым чытачам пра камп'ютарную залежнасць. Бо адрэгуляваць адносіны дзіцяці і камп'ютара для многіх бацькоў стала праблемай.***

— Адразу скажу, што ёсць два бакі — станоўчы і адмоўны. З аднаго боку, камп'ютар — гэта вельмі добра, гэта магчымасць атрымання новай інфармацыі, сродак стасункаў. Дый па выніках даследаванняў амерыканскіх навукоўцаў, маладыя людзі, якія захапляюцца камп'ютарам і інтэрнэтам, маюць лепшую паспяховасць у школе, яны часцей паступаюць у прэстыжныя ВНУ, потым уладкоўваюцца на больш прэстыжную працу. Але з іншага боку, празмернае сядзенне за камп'ютарам можа прывесці да залежнасці ад яго.

***— Але яно ж не адразу: сеў за камп'ютар, бац! — і ты залежны?***

— Правільна, чалавек праходзіць некалькі стадый. На першай ён проста захоплены: атрымлівае масу задавальнення, з радасцю садзіцца за камп'ютар, чымсьці цікавіцца, у нешта гуляе...

***— І што, гэта ўжо залежнасць?!***

— Калі чалавек мае проста лёгкую ступень захопленасці, то гэта яшчэ не залежнасць, гэта проста першая стадыя — ён прыйшоў, пагуляў і пайшоў, то тут гульня нясе сітуацыйны характар. Але калі ён захапляецца гульнёй, знаходзіцца за камп'ютарам усё болей і болей, то стадыя лёгкай захопленасці пераходзіць у наступную стадыю — проста захопленасці. Тут ён ужо сядзіць за камп'ютарам, пакуль не завершыць гульню, ён забывае пра час, пачынае есці за камп'ютарам, перастае рабіць урокі, яму не цікава мець стасункі з сябрамі. Гульня ўжо нясе сістэматычны характар. Праходзіць яшчэ колькі часу, і наступае трэцяя стадыя — ужо не захопленасць, а сапраўды залежнасць, калі чалавек становіцца заўзятым гульцом. Дарэчы, залежнасць падзяляецца на сацыялізаваную і індывідуалізаваную. Першая, гэта калі чалавек праводзіць за камп'ютарам вельмі шмат часу, але ён мае стасункі з такімі ж залежнымі людзьмі. Яны гуляюць ў сумесныя гульні, маюць гульнявую матывацыю, імкнуцца перамагчы адзін аднаго. Так, яны залежныя, але ў іх ёсць сваё кола стасункаў і яны меней схільныя да псіхічных і саматычных захворванняў надалей. А вось калі развіваецца індывідуалізаваная залежнасць, то чалавек становіцца адзінокім, меней узаемадзейнічае з навакольным светам, дыскамфортна адчувае сяыбе на вуліцы, перастае сачыць за сабой, забываецца паесці, мала спіць, а лепшым сябрам становіцца камп'ютар. Для яго камп'ютарная гульня — свайго роду наркотык: калі не прымаеш «дозу», то адчуваеш дыскамфорт і ўпадаеш у дэпрэсію. І нарэшце чалавек пераходзіць на стадыю прывязанасці, калі ён ведае, што ёсць камп'ютар, што ёсць камп'ютарныя гульні, але ён ужо не гуляе ў іх з такой захопленасцю, ён можа сказаць сабе «стоп», пачынае жыць звычайным жыццём, стараецца не садзіцца за «машыну», «трымае дыстанцыю». Калі з'яўляецца новая гульня, то чалавек прайграе яе і сіла залежнасці зніжаецца.

***— Дык што, атрымліваецца, залежнасць праходзіць сама па сабе?***

— У прынцыпе — так, чалавек праходзіць усе стадыі і вяртаецца ў жыццё, але не ўсе даходзяць да апошняй стадыі прывязанасці, каля 15 працэнтаў застаюцца на стадыі залежнасці. Бо ўсе тыя якасці, якія ў рэальным жыцці недасягальныя, рэалізоўваюцца ў камп'ютарнай гульні, і атрымліваецца, што гэта для чалавека больш цікава і насычана, чым навакольны свет.

***— Ого! Атрымліваецца як латарэя — пападзеш у гэтыя 15 працэнтаў або пашанцуе... Ала Фёдараўна, раскажыце, калі ласка, як жа развіваецца залежнасць ад камп'ютара ў дзіцяці.***

— Як правіла, калі бацькі купляюць камп'ютар дзіцяці, то яны спачатку вельмі рады, што яно ва ўзросце 4-6 гадоў самастойна сядзіць за камп'ютарам, гуляе, вучыць літары. Часта бацькі з гонарам кажуць, што іх дзіця валодае тэхнікай лепш за дарослых.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Тэлесеткі

# На АНТ пачынаецца гонка за сямейным шчасцем

**Дакладней, за матэрыяльным яго складнікам. Бо, па ўмовах новага тэлепраекта «Пасаг для нявесты», трывалыя пачуцці і стабільныя стасункі і гатоўнасць наведаць ЗАГС ва ўдзельніц і іх «другіх палавінак» — прысутнічаюць па змоўчанні. А вось рэчы, неабходныя для пачатку сямейнага жыцця будучай ячэйкі грамадства — уласна кажучы, той самы пасаг — тэлеканал АНТ прапануе выйграць у працэсе сямейнага шоу. У якасці галоўнага прыза пераможцу праекта чакае ні многа ні мала — 25 мільёнаў беларускіх рублёў.**

Яшчэ ў жніўні патэнцыйныя нявесты пачулі ў эфіры АНТ гэту заманлівую прапанову — сабраць сабе пасаг. Як аказалася, гэта і праўда была тая прапанова, ад якой амаль немагчыма адмовіцца. Ва ўсякім разе, больш як 2,5 тысячы жанчын адправілі свае анкеты. На кастынг была запрошана тысяча нявестаў, з якіх да пачатку шоу змаглі прабіцца толькі 50. Дакладней, 49 — бо адну вакансію заняў... хлопец, які быў гатовы прайсці ўсе выпрабаванні замест сваёй нявесты.



Гэтыя паўсотні чалавек і ўзялі ўдзел у масавым забегу ў вясельных сукенках і спартыўнай экіпіроўцы — шлемах, налакотніках, накаленніках ды красоўках. Пераможца гэтых незвычайных стартаў атрымала спецыяльны прыз і працягнула ўдзел у шоу, яшчэ 6 гераінь праекта адабралі члены журы. Аб тым, як гэта было і якія этапы давялося прайсці ўдзельніцам ва ўпартай барацьбе, вядучыя шоу «Пасаг для нявесты» Анжэліка Агурбаш і Ягор Хрусталёў пачнуць расказваць з гэтай нядзелі, 23 лістапада.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота прадстаўлена тэлеканалам.**

# «МЫ ДАНОСІМ НАВІНЫ ДА ЛЮДЗЕЙ...»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

На сёння «гаспадарка» прадпрыемства ў сталіцы складаецца з 28 стацыянарных гандлёвых аб'ектаў — магазінаў, 342 кіёскаў, размешчаных на вуліцах, у метро, на вакзалах, аэрапорце, у навучальных установах, а таксама трох павільёнаў. Абслугоўваюць яе каля тысячы чалавек, прычым 90 працэнтаў з іх працуюць непасрэдна ў рознічнай сетцы, на таварных базах і ў кругласутачных газетна-часопісных экспедыцыях. На прадпрыемстве маецца ўласны транспартны парк, ёсць свой рамонтна-будаўнічы ўчастак. Словам, ёсць усё, каб чытачы без праблем і своечасова атрымлівалі газеты і часопісы, іншыя тавары, што рэалізуюцца ў кіёсках і магазінах.

Ёсць шмат выпадкаў, калі на прадпрыемстве працуюць некалькі членаў адной сям'і — блізкіх родных. Як адзначыла Аксана Міхайлаўна, у тым ліку прыходзіць апошнім часам і даволі шмат моладзі. Патлумачыць гэта проста: за 90 гадоў свайго існавання РУП «Белсаюздрук» зарэкамендавала сябе як стабільнае прадпрыемства, якое ўпэўнена развіваецца і імкнецца рухацца наперад. Зноў жа, цвёрдыя сацыяльныя гарантыі для працаўнікоў. А што асобна да моладзі, дык усё кіраўніцтва на чале з дырэктарам Ігарам Віктаравічам Дудзічам даюць ёй поўную свабоду ў межах сваіх паўнамоцтваў, вітаюць ініцыятыву, прадастаўляюць усе магчымасці для прафесійнага і кар'ернага росту: праводзяць семінары, практыкуюць абмены вопытам. Гэта і прадбачлівасць, і патрабаванне часу.

— Цяпер, напрыклад, павялічваецца запатрабаванасць часопіснай прадукцыі, змяняюцца патрабаванні па яе выкладцы, — гаворыць Аксана Валгай. — Наша прадпрыемства, напэўна, адзінае, якое прапануе дзяржаўную прэсу ў поўным аб'ёме: кіёскі прадастаўляюць недзе 500 найменняў, магазіны, дзе крыху большыя магчымасці, — 700 найменняў (розніца ў асноўным за кошт неперыядычных выданняў).

Шмат увагі на прадпрыемстве надаецца газетным кіёскам, ад якіх тут, насуперак усім ранейшым чуткам і пагалоскам, адмаўляцца не збіраюцца. Наадварот, распрацоўваюцца і ўзгадняюцца ў Камітэце па архітэктуры Мінгарвыканкама новыя, сучасныя формы шапікаў. У іх улічана кожная дробязь — ад вышыні прылаўка да шырыні акенца, бо такі аб'ект павінен быць не толькі прыгожым, але і зручным для ўсіх. Сучасныя формы кіёскаў паспелі ўжо ацаніць многія мінчане, прыгадваю, як адзін з чытачоў назваў іх «футурыстычнымі, якія нагадваюць касмічны карабель і ўдала ўпісваюцца ў сучаснае аблічча горада».

— Так, — пацвярджае мая суразмоўца, — ад кіёскаў мы не адмовімся, паколькі разумеем, наколькі зручнымі яны з'яўляюцца для людзей. У новых мікрараёнах па магчымасці мы яшчэ на стадыі забудовы імкнёмся адразу закласці для іх «падмурак». Безумоўна, яны павінны быць адначасова і прыгожымі, і функцыянальнымі. Магчыма, ідучы насустрач патрабаванням часу, іх форма будзе змяняцца і надалей, напрыклад, з'явяцца кіёскі, дзе пакупнік будзе заходзіць унутр.

...На многіх кіёсках мінчане сёння могуць убачыць прыгожы надпіс «90 гадоў «Белсаюздруку». Так, сёння работнікі прадпрыемства святкуюць свой юбілей. Усе яны заслугоўваюць слоў удзячнасці і віншаванняў за тое, што не пакідаюць нас без свежых навін. І няхай шмат гавораць пра электронныя сродкі масавай інфармацыі (якія, несумненна, маюць права на жыццё), для многіх з нас па-ранейшаму яшчэ нешта значыць менавіта друкаванае слова, якое да чытачоў дапамагаюць данесці сціплыя кіяскёры. Калі будзеце сёння набываць у шапіку свежыя газеты ці часопісы, іншую патрэбную драбязу — абавязкова скажыце гэтыя цёплыя словы «свайму» кіяскёру. Са святам!

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Погляд на этнаскарбонку

# БЕЛАРУСКІ ГЕНАФОНД — АДЗІН З НАЙБОЛЬШ СТАРАЖЫТНЫХ У ЕЎРОПЕ

*Што ўяўляла Беларусь на працягу стагоддзяў? Край балот і лясоў, дзе чалавеку ўвесь час даводзілася адваёўваць у прыроды тэрыторыю для жыцця. Але гэтыя ж жорсткія ўмовы існавання спрыялі захаванню нашай беларускай адметнасці. Прыродная ізаляванасць нашай тэрыторыі паспрыяла таму, што беларускі этнас захаваўся ў чысцейшым выглядзе з даўніх часоў. Даследаванні, якія на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў праводзіць **доктар біялагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела антрапалогіі і экалогіі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксей Ігнатавіч МІКУЛІЧ**, паказваюць, што **карэнныя жыхары беларускіх вёсак вядуць свой радавод цягам не меней як 130—140 пакаленняў, гэта значыць пачынаючы прыкладна з сярэдзіны першага тысячагоддзя перад Нараджэннем Хрыстовым.***

«Як любы свядомы беларус я даволі рана пачаў цікавіцца сваім радаводам. І да навуковага пошуку паходжання беларусаў падышоў, ужо ведаючы пра сваіх продкаў (я маю свой радавод па бацькоўскай лініі з 1558 года). Беларускі этнас вывучаўся на вясковым насельніцтве. Гэта мой асабісты падыход. Для даследавання браліся карэнныя беларусы, апытвалася адкуль іх бацькі, дзяды і прадзеды. Вёска шануе і ведае сваіх продкаў да чацвёртага, а тое і пятага калена», — расказвае Аляксей Мікуліч. Вучоны ездзіў па вёсках Беларусі і па сумежных тэрыторыях у Расіі, Літве, Украіне. У экспедыцыях даследаваліся групы крыві, а таксама фізіялагічныя асаблівасці беларусаў. Прынамсі, антрапалагічныя прыкметы і генетычныя сістэмы для параўнаўчага аналізу выбіраліся такія, што перадаюцца з роду ў род у чыстым выглядзе. Гэтаму крытэрыю адпавядаюць такія морфафізіялагічныя асаблівасці, як зрокавае колераўспрыманне, афарбоўка вясёлкавай абалонкі, колер валасоў, смакавая адчувальнасць да фенілтыакарбаміду (рэчыва, якое ўваходзіць у склад звычайнай гумкі; па методыцы выяўлення мінімальнай парогавай канцэнтрацыі фенілтыакарбаміду, пры якой чалавек адчувае гаркату, можна вызначаць расавыя і этнічныя асаблівасці).



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Адкрыцці, зробленыя вучоным на падставе вялікай колькасці антрапагенетычных і генадэмаграфічных матэрыялаў, здзіўляюць. Здавалася б, суседзі павінны былі моцна паўплываць на нашу тэрыторыю, напрыклад, калі Беларусь уваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай і Маскоўскай імперыі. А колькі войнаў пракацілася праз Беларусь! Але дзякуючы вясковаму насельніцтву наш народ здолеў захаваць на генетычным узроўні свае адметнасці. Вёска была своеасаблівай скарбонкай спадчыннай інфармацыі. Людзі трымаліся сваёй тэрыторыі, і як правіла, для прадаўжэння роду выбіралі сабе партнёраў з мясцовых жыхароў.

«Чаму я паверыў, што мы «тутэйшыя» (найперш гэта было як гіпотэза)? Зноў жа дзякуючы вёсцы, яе культуры і традыцыям. Я сам з-пад Баранавічаў, я памятаю, як мая вёска спявала, памятаю легенды, узгадваю, як на вялікія святы ўвесь народ высыпаў на вуліцу. Фальклор і традыцыі там перадаюцца праз пакаленні. А яны, між іншым, даволі старажытныя, прыгадаю толькі наша Купалле — колькі ў гэтым беларускім свяце дахрысціянскага, паганскага», — дзеліцца сваімі думкамі Аляксей Мікуліч. Антраполаг вывучаў генафонд жыхароў пэўных вёсак, пасля яднаў звесткі па сходных прыкметах у асобныя этнаграфічныя рэгіёны, і затым вылучаў асаблівасці беларускага этнасу наогул. Вучоны параўнаў свае карты, створаныя на аснове вывучэння групаў крыві, з картамі, зробленымі этнографамі Яўхімам Карскім і Мітрафанам Доўнар-Запольскім па распаўсюджванні беларускіх гаворак яшчэ на пачатку XX стагоддзя, а таксама з атласамі беларускіх гаворак. Яго ўразіла, як карты супадалі: па ахопленай тэрыторыі яны фактычна накладаліся адна на другую. **Атрымліваецца, што там, дзе адрозніваюцца гаворкі, генетычныя даныя таксама могуць мець свае асаблівасці.** Сяляне маглі падзяляць людзей на «сваіх» і «чужых». Аляксей Ігнатавіч прыгадвае, як яго маці гаварыла пра жыхароў іншых вёсак: «там ужо не мы, а палешукі». Людзі перадавалі ў спадчыну і духоўную культуру, якая была характэрна для кожнага рэгіёна. Распаўсюджванне і беларускіх гаворак, і звестак біяхімічнага аналізу крыві, і фізіямарфалагічных асаблівасцяў насельніцтва паказвае, што **беларускі этнас засяляе тэрыторыю, якая выходзіць за сучасныя межы Беларусі. Людзі, падобныя да нас па знешнасці і па генным складзе, жывуць ля Вільні, Смаленска, Вялікага Ноўгарада, на сумежных украінскіх тэрыторыях. У агульных рысах арэал пражывання беларусаў адпавядае тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага.**

Здабытыя ў экспедыцыях звесткі даюць магчымасць абазначыць храналогію фарміравання беларускага этнасу. Даследаваны вучоным і яго калегамі генафонд пацвярджае тутэйшыя карані беларускага этнасу і дазваляе лічыць яго карэнным. Беларускі этнас прайшоў шлях фарміравання з часоў каланізацыі сучаснай тэрыторыі славянамі, захаваўшы антрапалагічныя рысы тагачасных балцкіх абарыгенаў. Банк звестак па марфафізіялагічных, гематабіяхімічных і малекулярна-генетычных прыкметах параўноўваўся з матэрыяламі археолагаў. Атрымалася, што антрапалагічныя звесткі па сучасным беларускім генафондзе шмат у чым адпавядаюць арэалам старажытных археалагічных культур. Напрыклад, заходнепалескі рэгіён знаходзіцца ў межах распаўсюджвання культуры шнуравой керамікі (XVIII—XIV стагоддзі перад Нараджэннем Хрыстовым), лужыцкай культуры (XV—XIV стагоддзі перад Н.Х.) бронзавага веку і паморскай культуры (IV—II стагоддзі перад Н.Х.) жалезнага веку.

У межах захаванасці адзінага генафонду беларускага этнасу з моманту яе прарадзіннага пачатку, **вучоным выяўлены шэраг лакальных папуляцый, якія маюць найменшую аддаленасць ад праэтнасу. Гэта ельская, лельчыцкая, петрыкаўская — на поўдні, полацкая і ўшацкая — на поўначы, наваградская — на паўночным захадзе. Такі складаны для пражывання край балот, як Палессе змог захаваць беларусаў у найбольш чыстым выглядзе, таму Аляксею Мікулічу ўдалося знайсці надта рэдкія групы крыві. Ізаляванасць беларускага Палесся спрыяла і рэгіянальнаму назапашванню рэцэсіўнага гена светлавокасці.**

**Прынамсі, Палессе не толькі паводле матэрыялаў антрапагенетыкаў, але і дзякуючы археалагічным знаходкам можна разглядаць у якасці магчымай прарадзімы славян.**

Дарэчы, кожны новы народ, што прыходзіць на ўжо абжытыя іншымі насельнікамі тэрыторыі, нясе карэнным жыхарам сваё, новае, не заўсёды спрыяльнае. Прышлыя людзі прывіваюць сваю культуру, перабудоўваюць пад сябе прыродныя ўмовы, што можа балюча адбівацца на ўзнаўленні мясцовага насельніцтва. І, што самае небяспечнае, новыя людзі могуць несці з сабой хваробы, да якіх карэнныя жыхары не прыстасаваныя. Таму натуральны адбор, калі выжываюць найбольш моцныя, таксама ўплывае на фарміраванне этнасу. Але палеантрапалагічныя матэрыялы і генагеаграфічныя звесткі дазваляюць меркаваць пра ашчадную асіміляцыю славянамі карэнных насельнікаў без іх вынішчэння, магчыма, ад часоў культуры шнуравой керамікі.

Трэба адзначыць, што **сабраная антрапагенетыкам інфармацыя дае падставу меркаваць, што беларуская папуляцыя найбольш за іншых адпавядае ўсходнеславянскай продкавай супольнасці. У генафондзе беларусаў практычна не выяўлена прыкмет мангалоіднай расы, гэта пацвярджае і гістарычныя звесткі пра тое, што наша тэрыторыя не зведала татара-мангольскага панавання.** А на рускіх вялікі ўплыў аказаў фіна-вугорскі этнас.

З моманту адкрыцця спадчынных законаў у біялогіі і канкрэтных генаў чалавека даследаваны амаль усе народы свету. Вывучэннем групаў крыві насельнікаў Расіі займаўся Юрый Рычкоў, ён быў настаўнікам, навуковым кіраўніком Аляксея Мікуліча. «Калі я паглядзеў яго працы па вывучэнні генафонду малых народаў Расіі, зразумеў, што беларусаў абавязкова трэба даследаваць. Усё ж у нас малых народаў няма, мы самі — параўнальна кампактны чысты народ. Акрамя таго, праз нашу тэрыторыю праходзілі гістарычныя шляхі з поўдня на поўнач, з захаду на ўсход», — гаворыць Аляксей Ігнатавіч. Сабраны па Беларусі і сумежных тэрыторыях банк звестак вучоны перадаў у маскоўскі Інстытут агульнай генетыкі М.І. Вавілава. На гэтых звестках былі пабудаваны карты зменлівасці генафонду Усходняй Еўропы. Такія карты даюць магчымасць не толькі параўноўваць этнасы паміж сабою, але і прасочваць міграцыйныя працэсы. **Так беларусы перамяшчаліся ў асноўным з поўдня на поўнач, а рускія — з захаду на ўсход.**

Паводле гіпотэзы Мікуліча генетычная структура насельніцтва заставалася стабільнай на працягу гістарычна значных адрэзкаў часу. Папуляцыя этнічных беларусаў вяскоўцаў з'яўлялася самаўзнаўляльным арганізмам, калі спадчынны матэрыял перадаваўся праз пакаленні карэнных жыхароў.

Што будзе надалей з нашым этнасам, калі колькасць вясковых жыхароў імкліва зніжаецца? Генетычны банк звестак, вядома, захаваецца. Менавіта вясковыя носьбіты продкавых генаў пераедуць у горад, якія характарызуюцца большай антрапагенетычнай разнастайнасцю. Неабходна яшчэ вывучаць, як змена экалагічных і сацыяльных умоў уплывае на генафонд. Памяншэнне нараджальнасці і павелічэнне спадчынных хваробаў уплываюць не на карысць генадэмаграфічнай сітуацыі. Памяншэнне вясковага насельніцтва адаб'ецца і на нашай спадчыннай культуры. Усё ж вёска— даволі кампактная тэрыторыя, дзе шануюць продкаў, наведваюць вясковыя могілкі і ведаюць свой радавод. Дзе культура, назапашаная стагоддзямі, перадаецца сама па сабе. Дзе яшчэ жыве беларуская гаворка. Дзе людзі шануюць сваю малую радзіму і адчуваецца своеасаблівы беларускі дух. Горад жыве па сваіх законах. Моладзь агулам захапляецца папсовай культурай, якую чуе дзякуючы тэхнічнаму прагрэсу, і не спявае на вуліцах старажытных песень. І нават Купалле тут часцей нагадвае гарадскую тусоўку, а не старажытнае свята. І калі прадстаўнікам старэйшых пакаленняў, адарваным ад родных мясцін, ўсё ж такі ёсць яшчэ што расказаць пра мінуўшчыну свайго краю і сваіх продкаў, дык сучасным маладым людзям, не звязаным з крыніцай старажытнай інфармацыі, ужывую, а не хрэстаматыйна наўрад ці будзе што перадаць у спадчыну...

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# ЛЮБОЎНЫ ЗАБЕГ



Цягнуць «спартсмена» да фінішу за ланцужок соскі дазваляецца!

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Падобнага, дакладна, нідзе больш не ўбачыш. З аднаго боку, у наяўнасці ўсе атрыбуты сур'ёзных спаборніцтваў: «старт» і «фініш», бегавыя дарожкі, секундамеры, балельшчыкі і журналісты. З іншага, самі спартсмены хвалююцца меней за ўсіх астатніх, і самае галоўнае, яны не думаюць ні з кім спаборнічаць. Проста ўсміхаюцца, атрымліваюць яўную асалоду ад такой колькасці ўвагі да сябе і... нікуды не паўзуць. Так было з першымі трыма ўдзельнікамі. Малыя селі на лініі «старту» і сталі з цікаўнасцю назіраць за такімі дзіўнымі дарослымі, якія сабраліся вакол іх, паўтараюць адно і тое ж: «Захар, давай!», успыхваюць бліскучымі чорнымі штучкамі, ляпаюць далонямі па падлозе і вельмі чамусьці хвалююцца. Нават мама паводзіць сябе неяк неадэкватна, падштурхоўвае ў спіну і паварочвае да сябе спінай, можа хоча, каб я пакачаўся? А тата яшчэ горш — на тым краі паласатага дыванка нешта крычыць, дастаў свой мабільнік, уключыў яго і зусім непрыстойна верціць у руках як цацку. Між тым усім вядома, што гэта салёная на смак штука зусім не цацка, як і ключы, якімі ён чамусьці адчайна трасе... Пасядзеўшы столькі, колькі ім захацелася, агледзеўшы і ацаніўшы сітуацыю, малыя нарэшце папаўзлі, але не ўздоўж дарожак, а ўпоперак, адзін да аднаго, альбо да чужых цётачак і дзядзечак з бліскучымі штукамі ў руках.

І ўсё ж такі спаборніцтва ўдалося. Малыя змаглі дабіцца ад дарослых таго, што ім было патрэбна. Напрыклад, каб маці былі не на старце, а на фінішы, і каб тата дазволіў, нарэшце, схапіць і адзець на сябе яго акуляры, і нават сам прапанаваў пульцік ад тэлевізара і камп'ютарную мышку, і не адняў пасля гэтага, але самае галоўнае, каб усе дарослыя свяціліся ўсмешкамі, былі ласкавыя і вясёлыя, і, нарэшце, расслабіліся, бо зразумелі, ШТО ў гэтых спаборніцтвах галоўнае і ХТО — пераможца!

— Гэта другое наша сумеснае мерапрыемства з Міжнародным грамадскім аб'яднаннем «Разуменне», — расказала карэспандэнту «Звязды» дырэктар кінатэатра «Перамога» Святлана Саўчык. — У красавіку ў фае, якое вельмі добра падыходзіць для арганізацыі экспазіцый, прайшла выстаўка-інсталяцыя «Салёнае дзяцінства», якая мела вялікі поспех. Цяперашняя акцыя — працяг вясновай, яна і назву мае адпаведную: «Салёнае дзяцінства — Сілуэты», і тыя ж мэты — фарміраванне грамадскага меркавання па пытаннях папярэджання гвалту над дзецьмі і грэбавання імі. Забег немаўлятак — толькі адна з частак мерапрыемства, якое доўжыцца тыдзень. У панядзелак у кінатэатры адкрылася выстаўка, у сераду, 19 лістапада, у Сусветны дзень папярэджання гвалту над дзецьмі, прайшла дзіцячая сесія «Свабодны мікрафон», дзе кожнае дзіця любога ўзросту магло выказаць сваё меркаванне пра тое, што павінны зрабіць дарослыя, каб дзеці раслі ў бяспечным свеце. Нарэшце, сёння, у Дзень прыняцця Канвенцыі ААН «Аб правах дзіцяці» — забег паўзункоў. Тое, што зараз адбываецца — проста дзіва. Я назвала б гэта — Акт любові. Прычым гэты цуд сёння будзе доўжыцца на працягу дня, бо гэта толькі пачатак, усяго больш за 70 немаўлятак удзельнічаюць у спаборніцтвах. І ўсе яны тут як кіназоркі, купаюцца ў любові, адчуваюць, наколькі яны цудоўныя, бо бачаць гэта ў вачах дарослых. І дарослыя, не толькі бацькі, маюць магчымасць палюбавацца дзецьмі, парадавацца іх рухам, адчуць сябе шчаслівымі ад іх усмешак. І нарэшце, на свае вочы ўбачыць, што свет сям'і — гэта самае галоўнае ў жыцці чалавека, і вельмі важна яго захаваць і абараніць. Дзеці робяць шчаслівымі нас, і мы павінны зрабіць шчаслівымі іх.



І чаго гэтыя дарослыя так хвалююцца?!

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# ІСПАНСКАЯ КРЫЖАВАНКА

**Крыжаванкі такога кшталту звычайна называюць «іспанскімі». У іх ёсць некалькі асаблівасцяў. Злева і справа ад «гульнявога поля» дадзены вызначэнні загаданых слоў па гарызанталях, а зверху і знізу — па вертыкалях. Дакладныя месцы для адгаданых слоў вам трэба шукаць самастойна. У дужках паказана, колькі літар павінна быць у адгаданых словах. І яшчэ: словы павінны аддзяляцца адно ад аднаго сама меней адной пустой клеткай. У якасці падказкі некаторыя з пустых клетак ужо заштрыхаваны.**

Зверху: Штат у Індыі (4); Медны духавы музычны інструмент (5); Гатунак сталовага вінаграднага віна (7); Сталіца Нарвегіі (4); У тэатры — акцёр у ролі без слоў (7); Балет Андрэя Эшпая (6); Вада ў газападобным стане (4); Шкала і стрэлка ў прыборы (разм.) (4); Горны масіў у Балгарыі (4).

Злева: Канат з пянькі або сталёвага дроту (4); Механічны муз. інструмент-скрыня (7) — *на фота*; Сок адціснутага вінаграду (5); Цвёрдая абалонка таблеткі (7); Возера ў Заіры (3); Чарадзей, чараўнік (3); Рака і горад у Калужскай вобласці РФ (6); Літара грэчаскага алфавіту (3); Горад у Японіі, дзе была зімовая Алімпіяда (6); Магчымая небяспека, пагроза (6).

Справа: Прыстасаванне для ўзмацнення гуку (5); Выяўлены праверкай недахоп сродкаў (7); Буйное мора-возера ў Азіі (4); Службовае месца (6); Непрацаздольны ў выніку траўмы, ранення (7); Англійскі мараплавец XVIII ст. (3); Вершаваная двухскладовая стапа (3); Пайменаваная вобласць даных у ЭВМ (4).

Знізу: Высокі мужчынскі голас (5); Персанаж «Паўлінкі» Я. Купалы (5); Балотная травяністая высокая расліна (5); Крывападцёк на целе (5); Лёгкі летні капялюшык (6); Асобная частка паверхні (7); Павелічальнае шкло ў апраўе (4); Вязкі асадак на дне вадаёма (2).





**Склаў Яўген ЛЯХАЎ.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.49 | 16.02 | 8.13 |
| Віцебск — | 7.44 | 15.46 | 8.02 |
| Магілёў — | 7.39 | 15.52 | 8.13 |
| Гомель — | 7.29 | 15.56 | 8.27 |
| Гродна — | 8.02 | 16.18 | 8.16 |
| Брэст — | 7.56 | 16.25 | 8.29 |

**Месяц**

***Апошняя квадра.***
***Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.** Гаўрылы, Міхаіла, Рафаіла.*
***К.** Марыі, Рэгіны, Альберта, Кандрата, Яна.*





## 21 лістапада

Дзве даты

**Сёння — Сусветны дзень тэлебачання.**

**1869 год** — у маёнтку Крупляны (зараз Карэліцкі раён) нарадзіўся беларускі жывапісец і педагог Казімір Стабpоўскі. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі, Польшчы, Расіі. У 1887—1894 гадах вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, пасля жыў і працаваў на Гродзеншчыне. Удзельнічаў у мастацкіх выстаўках у Пецярбургу, Парыжы, Мюнхене, Венецыі. Заснавальнік і кіраўнік Школы прыгожага мастацтва ў Варшаве. Стварыў кампазіцыі фантастычна-сімвалічнага характару, пейзажы, партрэты ў стылі мадэрн.



**1918 год** — Савет Народных Камісараў прыняў Дэкрэт аб усталяванні ва ўстановах пошто-тэлеграфнага ведамства продажу выпускаў савецкага друку. Гэтаму ведамству, у прыватнасці, належала займацца распаўсюджваннем і экспедзіраваннем газет і часопісаў.

Цытата дня:

***«Калі б жанчыны апраналіся модна і прыгожа для аднаго толькі мужчыны, гэта не працягвалася б так доўга».***
**Марсель Ашар (1899—1974), французскі драматург.**

# 21 ЛІСТАПАДА — МІХАІЛ, МІХАЛ, МІХАЙЛАЎ ДЗЕНЬ

Свет і сусвет чалавека

**Згодна з вучэннем Царквы, ангельскія сілы падзяляюцца на іерархіі і чыны. Усіх чыноў дзевяць: Серафімы, Херувімы, Прастолы (вышэйшыя чыны); Гаспадства, Сілы, Улады (сярэднія чыны), Пачаткі, Архангелы, Анёлы (ніжэйшыя чыны). Над усімі чынамі Госпадам Богам пастаўлены галоўным Архістраціг Міхаіл (з яўрэйск. — «хто як Бог»). Ён верны служка Боскі, які здзейсніў шмат подзвігаў у гонар Госпада. Па царкоўным паданні, Архістраціг Міхаіл браў удзел у шматлікіх старазапаветных падзеях, шмат цудаў здзейсніў на Русі. У гонар яго пабудавана шмат манастыроў, саборных, палацавых і пасадскіх храмаў. Святкаванне ў гонар Нябесных Сілаў — бесцялесных істот духоўнага свету, веснікаў і выканальнікаў волі Бога, і іх «кіраўніка», Архістратыга Міхаіла, было прызначана Царквой на пачатку IV стагоддзя. Архангелу Міхаілу моляцца аб пазбаўленні ад хваробаў, а таксама аб выратаванні ад розных бедаў і смутку, на пачатку будаўніцтва новай хаты і пры ўваходзе ў яе. Міхайлаў дзень адзначаецца двойчы на год: 19 верасня і 21 лістапада.**

- У народных уяўленнях святы Міхаіл быў пераможцай нячыстай сілы, дракона і ўсяго д'ябальскага, збавіцелем ад розных бедаў і нашэсцяў. Таму ў дзень яго ўшанавання наладжвалі вялікае і вясёлае святкаванне: «І па вёсках піры, і па хатах госці».
- У Беларусі святы Міхаіл вядомы таксама як ахоўнік ад грому. У гэты дзень імкнуліся не працаваць: «Не трэба рабіць у гэты дзень, бо Міхайла злы — дахі рве».
- Набліжаўся Пілілаўскі пост (з 28 лістапада), таму святочны дзень на Міхала называлі апошнім святам года: «Міхайла — усім святкам запіхайла, пасля Міхайла ўжо няма святкаў да Раства».
- У гэты дзень асабліва ўшаноўваліся людзі сталага веку: унукі павінны былі абавязкова наведаць сваіх бабуль і дзядуляў.
- Каб на працягу года спрыяў поспех у ткацтве, ведалі, што да Міхала трэба было саткаць «першыя» кросны, «другія» — на святога Філіпа, «трэція» — да Мясаеда, «чацвёртыя» — на Вялікі пост.
- У гэты дзень жывёлу ўрэшце заганялі ў стойла — на зімовы корм.
- Таксама лічылася, што з Міхайлава дня мядзведзь — гаспадар лесу — кіруецца ў бярлогу на зімовы адпачынак.
- Шматлікія назіранні за надвор'ем у гэты дзень насілі самы супярэчлівы характар. Гэтаму дню прыпісвалі і Міхайлаўскія адлігі, і Міхайлаўскія прымаразкі — кожны год па-рознаму. Паўсюдна Міхайлаў дзень лічыцца пэўнай рубежнай датай — паміж восенню і зімой.

*Кузьма (14 лістапада) закуе, а Міхайла раскуе (будзе адліга).*
*Які Міхаіл, такі і Мікола Зімовы.*
*Калі Міхайла шлях парушыць — не чакай добрага надвор'я да Міколы Зімовага (19 снежня).*
*Міхайла масты мосціць.*
*На Міхаіла зіма не стаіць, не мёрзне.*
*З гэтага дня зіма «на ногі становіцца».*
*З дня Міхаіла Архістраціга зіма маразы куе.*
*На Міхайлу раздарожжа — да зімовага Міколы шляху не будзе.*
*Калі Міхайла ў снягу, то і Пасха ў снягу, а як не, дык і не.*

- У пчаляроў былі свае назіранні за надвор'ем: «Калі на Міхайла-Рахайла на сцёках лёд, то будзе ў пчалавода мёд».

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

**— Я ж цябе прасіла, Ігар, не перашкаджаць мне! З-за цябе я выпусціла паваранаю кнігу, яна закрылася, і зараз я не ведаю, што зварыла на абед!**

☺

Анджэліна Джалі вырашыла ўсынавіць яшчэ 14 в'етнамскіх хлопчыкаў і збіраецца адкрыць цэх па пашыве куртак.

☺

**— А як я вас пазнаю?**
**— Я буду справа ў вясельнай сукенцы, дурань!**

☺

Зіма. На прыпынку стаіць задубелы мужык, рукі ў штаны... Падыходзіць да яго хлопчык:
— Дзядзька, якая гадзіна?
— Летам, хлопчык, усё — летам...

☺

**— Вовачка, паглядзі ў акно, ці вяртаецца тата з бара?**
**— Ужо вяртаецца.**
**— А па якім баку вуліцы ідзе?**
**— Па абодвух!**

☺

«Я знайшоў сабе дзяўчыну. Разумную, добрую, верную, прыгожую... Быў шчаслівы!.. Пакуль разумная не даведалася пра добрую, а верная — пра прыгожую...»





Акалоўская сярэдняя школа Лагойскага раёна запрашае выпускнікоў і настаўнікаў на святкаванне 100-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ ШКОЛЫ 13 снежня 2008 года ў 12.00.
**Адміністрацыя Акалоўскай СШ.**

